

САКРЭТЫ ГАЛОЎНАГА ДЗЕДА МАРОЗА 9

ЯК БАВІЛІ ЗІМОВЫЯ СВЯТЫ ЛІТАРАТУРНЫЯ ГЕРОІ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 СНЕЖНЯ 2021 г. ПЯТНІЦА № 253 (29622)

# З надыходзячым!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Дзве тысячы дваццаць другі*
*Імклівa прыйшоў праз снягі.*
*Дабраўся, не змерз па дарозе*
*І ціха стаіць на парозе.*

*Упусцім. Сустрэнем цяплом*
*За шчодра накрытым сталом,*
*Пад келіхаў звон прывітаем,*
*Яму і сабе пажадаем:*

*Здароўя — канешне, яго*
*Жадаем усім кожны год.*
*Удачы ў справах — вядома.*
*Спакою — у краіне і дома.*

*Без грошай — таксама ніяк.*
*Хоць шчасце не купіш, аднак*
*А раптам усё ж давядзецца?*
*Дык хай і капейка вядзецца.*

*Паболей каб радасных дзён.*
*І працы каб бачылі плён.*
*Каб сонца ў вокны свяціла,*
*Каб поле багата ўрадзіла.*

*Каб згода і мудрасць жылі*
*На нашай прыгожай зямлі...*
*Каб так — ва ўсе дні маладога*
*Дзве тысячы дваццаць другога!*

***Звяздоўцы.***

ISSN 1990 — 763X

# АСНОВАТВОРНАЕ — ГЭТА ЗАКОНЫ І АДЗІНСТВА ЎСІХ НАС

**Працягваем публікаваць меркаванні аб Праекце змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Гэтым разам мы запісалі разважанні вядомых у краіне людзей, палітычных і грамадскіх дзеячаў.**

**Але выказацца наконт прапанаваных змяненняў можа кожны. Як паведаміў дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім Іпатаў, можна ўносіць свае прапановы да таго моманту, як будзе выдадзены ўказ аб назначэнні рэферэндуму. «Калі гаварыць аб канкрэтных датах, то гэта 17, 18, 19 студзеня. Але думаю, што не трэба некуды далёка адкладваць, менавіта цяпер ёсць магчымасць гэта зрабіць. Праект падрыхтаваны, ён размешчаны ў электронным выглядзе, даступны ў друкаваным выглядзе. Таму трэба проста яго прачытаць, над ім падумаць і ўнесці прапановы, не адкладваючы ўсё на апошні дзень, — сказаў Вадзім Іпатаў. — Таму што якраз бліжэйшыя да завяршэння публічнага абмеркавання дні неабходны прафесіяналам, каб усё гэта скампанаваць, апрацаваць, акумуляваць».**

**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**



— Сітуацыя ў свеце змяняецца, таму мы павінны працаваць на апярэджанне, прымаючы тыя законы, якія патрэбныя сёння нашай краіне і людзям. Калі мы працавалі над новым праектам Канстытуцыі, вядома, у сваёй рабоце выкарыстоўвалі і тое, пра што казалі людзі. Мы кожны раз вельмі ўважліва ставімся да таго, аб чым яны гавораць у плане сацыяльных напрамкаў. Таму што наша краіна — прававая дзяржава: мы жывём па Канстытуцыі і наша краіна развіваецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі. Жыццё паказвае, што гэта абсалютна правільныя падыходы.

Дарэчы, усе сацыяльныя праекты і праграмы, якія ўзяла на сябе дзяржава, выконваюцца: ні адна праграма не спыненая, усё вырашаецца ў планавым парадку. Пенсіі, дапамогі выплачваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме. Паступова павялічваецца колькасць шматдзетных сем'яў: калі ў 2014 годзе іх было 77 тысяч — сёння ўжо 120 тысяч. Гэта дзякуючы тым праграмам, якія дзейнічаюць у нашай краіне.

Трэба дакладна ўсведамляць: усё, што адбываецца ў тваёй краіне і што будзе заўтра, у якой краіне мы будзем жыць — залежыць ад кожнага з нас. Калі мы будзем гэта разумець і шанаваць, тады і вынік будзе больш хуткі і эфектыўны.

Тое, што сёння прапаведуюць заходнія краіны ў адносінах да інстытута сям'і — гэта не наша культура, не наш менталітэт. У школе пра гэта казаць ужо позна, трэба яшчэ ў дзіцячым садку расказваць, што ў сям'і павінны быць мама і тата, аб павазе адно да аднаго. Тыя каштоўнасці, якія сёння навязвае Захад — гэта шлях у нікуды, гэта не нашы падыходы. Нашы традыцыі павінны быць нашымі. Таму калі мы працавалі над праектам Канстытуцыі, дзе замацавана, што шлюб — гэта саюз паміж мужчынам і жанчынай — усе падтрымалі гэтую прапанову. Хто б мог падумаць, што гэта трэба будзе прапісваць заканадаўча?!

Таксама ўсе падтрымалі прапанову аб тым, што памяць аб Вялікай Айчыннай вайне непарушная і святая. Хто мог уявіць, што праз 80 гадоў з пачатку той страшнай трагедыі ў нашай краіне мы павінны будзем запісаць гэта ў Канстытуцыю?

Трэба разумець, што асноватворнае — гэта законы і адзінства ўсіх нас. Лепшай за нашу краіну няма. Таму мы павінны зберагчы ўсё, што завявала старэйшыя пакаленнямі і што мы стварылі сваёй працай за гэтыя гады.

**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**



— Сёння з боку Захаду ідзе вельмі агрэсіўнае навязванне нашаму народу, краіне лжывых, чужых нам арыенціраў. Прычым ва ўсіх сферах — ад культуры, гісторыі, сацыяльнай сферы да эканомікі.

Мы ўсе бачым, як яны спрабуюць разбурыць традыцыйны інстытут сям'і. Як імкнуцца перапісаць гісторыю і праўду аб Вялікай Айчыннай вайне. І ўжо кажуць, што гэта ледзь не нашы дзяды і прадзеды напалі на іх з вайной. Калі гэтаму не паставіць заслону, мы разумеем, да чаго гэта можа прывесці. Далёка за прыкладамі хадзіць не трэба. У некаторых краінах ужо сёння фактычна ўведзена забарона на святкаванне Дня Перамогі і ў адкрытую падтрымліваецца нацызм. Для нас, беларусаў, гэта фактычна здрада нашай памяці.

У эканоміцы нам спрабуюць навязаць заходнюю мадэль эканомікі, дзе ў прыярытэце не чалавек, а выключна бізнес і грошы. Менавіта таму нам настойліва кажуць, маўляў, адмоўцеся ад сацыяльных праграм, зрэжце падтрымку шматдзетных, перавядзіце медыцыну на платныя рэйкі і гэтак далей.

Для нас, беларусаў, усё гэта непрымальна. Таму ў прапанаваных змяненнях Канстытуцыі закладзены механізмы, якія даюць надзейную страхоўку ад падобных падыходаў у эканоміцы і сацыяльнай сферы.

Гэта, у першую чаргу, палажэнні аб захаванні сацыяльнага курсу дзяржавы, падтрымцы найбольш уразлівых катэгорый людзей — сем'яў з дзецьмі, інвалідаў, пажылых людзей, стварэнні ўмоў для развіцця кожнага чалавека. Гэта вельмі важна, паколькі, яшчэ раз падкрэсліваю, нягледзячы на ўсе складанасці і ўсе пераўтварэнні, якія будуць у далейшым, сацыяльная арыентаванасць палітыкі і эканомікі застанецца адным з галоўных вектараў дзяржавы.

Безумоўна, прафсаюзы падтрымліваюць гэтыя напрамкі нашага агульнага далейшага развіцця. Таксама мы адназначна падтрымліваем тэзіс праекта Канстытуцыі аб неабходнасці захавання гістарычнай праўды аб подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Сумесна з ветэранамі, моладдзю мы на працягу многіх гадоў працуем у гэтым кірунку. І бачым, што гэтая тэма адгукаецца ў абсалютнай большасці беларусаў. Усю праўду аб тых трагічных падзеях, аб тым, як нашы прадзеды і дзяды абаранялі сваю Радзіму, трэба захаваць і перадаць нашым дзецям. Гэта агульная пазіцыя ўсіх канструктыўных, патрыятычна настроеных грамадскіх аб'яднанняў. Таму сёння мы дзейнічаем з імі ў адным ключы і разам працуем над захаваннем таго, што дорага кожнаму беларусу — нашых традыцый як у гісторыі, культуры, так і ў сацыяльнай сферы.

**Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая мае месца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

***Лілія АНАНІЧ*, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:**



— Лічу, што вынясенне на ўсенароднае абмеркаванне праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю мае лёсавызначальнае значэнне для далейшага развіцця Беларусі, бо распрацоўцы праекта папярэднічаў вялікі грамадскі дыялог. Цяпер выносяцца на рэферэндум сапраўды выказаныя народам прапановы, якія набываюць абрысы Асноўнага Закона краіны. Гэта своеасаблівы адказ на грамадскі і дзяржаўны запыт пераўтварэнняў. Але пераўтварэнняў, скіраваных на далейшае эвалюцыйнае развіццё, з захаваннем найлепшага, што створана за апошнія гады, а не на злом існуючага ладу, як падштурхоўвалі замежныя нядобразычліўцы. Беларускі народ, яго мудрасць і воля, ляжаць у аснове нашага памкнення развіваць незалежную, сацыяльна арыентаваную Беларусь, краіну, утульную для жыцця людзей і спрыяльную для гарманічнага раскрыцця патэнцыялу асобы на карысць грамадства.

Калі коратка падсумоўваць прапанаваныя змяненні, лічу важным падкрэсліць наступнае.

Па- першае, замацаванне суверэннасці нашай дзяржавы, захаванне нашай самабытнасці, сацыяльна справядлівага грамадства, недапушчальнасць знешняга ўздзеяння, у тым ліку і праз фінансаванне з-за мяжы. Гэта асноватворныя пазіцыі.

Па-другое, абавязак дзяржавы забяспечыць захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта найважнейшая фундаментальная каштоўнасці, што надаюць моц дзяржаве праз зцітаванне пакаленняў, пераемнасць пакаленняў.

Па-трэцяе, замацаванне інстытута традыцыйнай сям'і і вызначэнне шлюбу як саюза мужчыны і жанчыны, абавязацельстваў бацькоў выхоўваць у дзяцей павагу да законаў, прывучаць іх да гістарычных і нацыянальных традыцый, рыхтаваць да карыснай працы на агульны дабрабыт. У гэтым мне бачыцца моцны маральна-этычны кантэкст грамадскага развіцця. І не менш важна, калі дзяржава забяспечвае высокі сацыяльны ўзровень, даступнасць карыстання дзяржаўнымі паслугамі ў сферы аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны, то і грамадзяне павінны несці салідарную адказнасць за назапашванне нацыянальнага дабрабыту.

Дамінантай змяненняў лічу замацаванне ў Асноўным Законе вышэйшага прадстаўнічага органа нашай краіны — Усебеларускага народнага сходу — з яго найважнейшай задачай — забяспечваць непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадскую згоду.

Таксама крокам наперад лічу далейшае развіццё палітычнай сістэмы, наданне дадатковых паўнамоцтваў парламенту і ўраду.

Вышэйпададзенае, вядома, — першы погляд і першыя думкі пасля азнаямлення з тэкстам праекта Канстытуцыі. Мяркую, кожны з нас, грамадзян Беларусі, абавязаны ўважліва аднесціся да тэксту прапанаваных змяненняў. Тым больш як дэпутат (а мне ўжо давялося весці гутаркі ў калектывах) прадбачу і магчымыя пытанні. Напрыклад, ці дарэчна ў гэты няпросты перыяд, ва ўмовах знешняй агрэсіі, пераразмяркоўваць паўнамоцтвы паміж галінамі ўлады? Зрэшты, усе разважанні, калі яны маюць пад сабой грунтоўныя падставы, маюць права на існаванне. На тое і разлічана ўсенароднае абмеркаванне, каб кожны грамадзянін краіны меў магчымасць сфармуляваць сваю пазіцыю, давесці яе і зрабіць на рэферэндуме свой асэнсаваны выбар на карысць квітнеючай, заможнай, незалежнай, сацыяльна арыентаванай Беларусі.

**Алена БОГДАН, член Канстытуцыйнай камісіі, старшыня Беларускага саюза жанчын, старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама:**



— Неабходнасць унясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю сёння прадыктавана часам і ўзроўнем развіцця нашай дзяржавы. Наша Канстытуцыя цалкам захоўвае сваю сацыяльна арыентаваную накіраванасць, але пры гэтым дзяржава бярэ на сябе дадатковую адказнасць перад грамадзянамі.

У папраўках да Канстытуцыі гаворыцца аб патрыятызме, захаванні гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны — гэта таксама прадыктавана часам. Звярніце ўвагу, што адбываецца навокал: ва Украіне адраджаюцца нацысцкія і неанацысцкія фарміраванні, дэкларацыю ААН аб недапушчальнасці гераізацыі нацызму не падпісваюць Францыя, Германія, Польшча, Украіна. Таму натуральна, што сёння мы імкнёмся залажыць захаванне гістарычнай памяці ў нашу нормаў.

З улікам развіцця інфармацыйных тэхналогій, узнікла неабходнасць стварыць у краіне ўмовы для абароны персанальных даных, бяспекі грамадства і асобы. І дзяржава бярэ на сябе такія абавязацельствы, прапісваючы гэта ў 28-м артыкуле Канстытуцыі.

Беларусь на сённяшні момант з'яўляецца краінай, на тэрыторыі якой пабудавана атамная электрастанцыя, пры гэтым Рэспубліка Беларусь гарантуе бяспеку і развівае атамную энергетыку выключна ў мірных мэтах.

32-і артыкул дакумента звяртае ўвагу на сям'ю. Яшчэ дзясятак гадоў таму мы не маглі нават падумаць, што неабходна будзе настолькі канкрэтызаваць тое, што шлюб — гэта саюз жанчыны і мужчыны, што муж і жонка маюць роўныя правы ў шлюбе. Канкрэтызуюцца нормы ў гэтым артыкуле і аб тым, што дзяржава аказвае падтрымку дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, увогуле сем'ям з дзецьмі, а не толькі шматдзетным. Гэта сведчыць аб сацыяльнай накіраванасці нашай дзяржавы. Дзяржава таксама бярэ на сябе абавязацельства садзейнічаць духоўнаму, маральнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю маладых людзей, стварае для гэтага неабходныя ўмовы, у тым ліку садзейнічае ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу нашай моладзі ў інтарэсах усяго грамадства.

Дзяржавай таксама рэалізуецца палітыка сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў, стварэння даступнага асяроддзя, паляпшэння якасці іх жыцця, падтрымкі сем'яў, у якіх яны пражываюць. Усё гэта адлюстроўвае 47-ы артыкул Канстытуцыі.

Досвед мінулага года паказаў неабходнасць прапісаць і забарону на фінансаванне выдаткаў, падрыхтоўку і правядзенне выбараў замежнымі дзяржавамі і арганізацыямі. Сёння мы маем разуменне, што замежныя арганізацыі ніколі не будуць адстойваць інтарэсы нашай краіны — яны будуць адстойваць інтарэсы ўласных дзяржаў.

Асобная глава Канстытуцыі прысвечана Усебеларускаму народнаму сходу. УНС — орган, які павінен стаць гарантам стабілізацыі грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне, і, вядома, ён надзяляецца вельмі шырокімі паўнамоцтвамі. За час існавання суверэннай Беларусі УНС праводзіўся шэсць разоў і склікаўся ў часы няпростых грамадска-палітычных варункаў у нашай краіне.

Само жыццё прадыктавала неабходнасць уносіць змяненні ў гэты дакумент, пачынаючы ад прэамбулы Канстытуцыі, дзе прапісваюцца культурныя, духоўныя традыцыі нашай краіны, гаворыцца аб тым, што мы хочам забяспечыць мір, дабрабыт кожнага грамадзяніна і, самае галоўнае, імкнёмся пабудаваць сацыяльна справядлівае грамадства.

Мы бачым, што дзяржава бярэ на сябе вельмі шмат, і таму ад грамадзян чакаецца, што яны будуць падтрымліваць сваю дзяржаву і эканоміку краіны.

**Запісалі Вольга АНУФРЫЕВА, Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Спорт

# СЯРЭБРАНЫЯ НАШЫ ХЛОПЦЫ!

**У Зале алімпійскай славы штаб-кватэры НАК Беларусі адбылося ўшанаванне хакейнай каманды (U-18) — сярэбраных медалістаў XV зімовага Еўрапейскага юнацкага алімпійскага фестывалю (ЕЮАФ) у Вуакаці ў Фінляндыі.**



У Вуакаці беларуская хакейная каманда (U-18) у матчах кругавога турніру абыграла зборныя Расіі, Чэхіі, Латвіі і заняла выніковае другое месца.

«Дзякуючы зладжанай рабоце ў камандзе і індывідуальным дзеянням вам удалося дабіцца значнага выніку на Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі. Гэта агульны поспех. Спадзяюся, для вас выступленне на ЕЮАФ стане добрым стартам у прафесійнай кар'еры. Перамагайце і далей, а мы будзем у гэтым вас усяляк падтрымліваць», — сказаў **прэзідэнт НАК Беларусі Віктар ЛУКАШЭНКА.**

Міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук адзначыў, што ў краіне шмат зроблена для развіцця хакея з шайбай. «Пазітыўныя моманты, якія сёння адбываюцца ў нашым хакеі, — гэта вынік работы федэрацыі на працягу некалькіх гадоў, можа і не такі хуткі вынік, як многім хацелася б, але вяртанне ў эліту маладзёжнай зборнай, сярэбраныя ўзнагароды фестывалю ў Вуакаці паказваюць добры ўзровень нашых юных гульцоў.



Многія маладыя хакеісты ўжо ў мінскім «Дынама» добра сябе зарэкамендавалі, а Аляксей Протас і зусім выступае ў НХЛ у адным звяне з Аляксандрам Авечкіным. Дзякуй вам усім за вашу работу», — сказаў Сяргей Кавальчук.

У цырымоніі ўшанавання ўзялі ўдзел і члены Выканкама НАК, сярод якіх вядомыя спартсмены, алімпійскія чэмпіёны і кіраўнікі федэрацый.

**Фота БелТА.**

На мяжы

# Нічога святога

## Каляды і Новы год — не прычына для Польшчы спыніць гвалт над бежанцамі

**«Уначы 29 снежня на беларуска-польскай граніцы паблізу пункта пропуску «Пясчатка» беларускія пагранічнікі знайшлі двух грамадзян Сірыі. Адзін з іншаземцаў не мог самастойна перамяшчацца з-за пашкоджання сустава. Паводле слоў бежанцаў, траўмы былі нанесены польскімі сілавікамі пры іх выцісканні да граніцы з Беларуссю. Акрамя таго, мужчыны былі моцна знясіленыя і прыгнечаныя. Далейшае знаходжанне ў падобным стане пагражала ім немінучай гібеллю», — паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце Беларусі.**

Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, якая прыбыла на месца, аператыўна даставіла людзей ва ўстанову аховы здароўя для аказання неабходнай дапамогі. Па выніках агляду, у аднаго з мужчын дыягнаставаны закрыты пералом нагі са зрухам.

«Усё паказвае на тое, што хрысціянства, гуманізм і правы чалавека сталі ў Польшчы толькі пустым гукам», — дадалі ў ведамстве.

Падарунак да свята

# У СУПЕРСУЧАСНЫМ ФАРМАЦЕ

**На Гомельшчыне рэгулярны рух электрацягнікоў звязаў Калінкавічы, Светлагорск і Жлобін. Урачыстая цырымонія адкрыцця электрыфікавага ўчастка чыгункі адбылася на вакзале станцыі Калінкавічы.**



Тут прайшоў урачысты мітынг з удзелам **намесніка прэм'ер-міністра Анатоля СІВАКА** і **міністра транспарту і камунікацый Аляксея АЎРАМЕНКІ.**

Са знакавай для рэгіёна і краіны ў цэлым падзеяй прысутных павіншаваў **начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір МАРОЗАЎ.** Як было адзначана, сімвалічна, што запуск рэгулярнага руху электрацягнікоў на ўчастку Гомельшчыны супаў з гадавінай адкрыцця рэгулярнага чыгуначнага руху на Беларусі. Так, паміж першым гудком паравоза на перагоне Гродна — Парэчча і цяперашняй падзеяй роўна 159 гадоў.

Як адзначыў Уладзімір Марозаў, нягледзячы на перамены, якія адбыліся крыху больш за паўтара стагоддзя, Беларуская чыгунка і ў XXI стагоддзі па-ранейшаму застаецца адной з галоўных транспартных камунікацый. Сёння ў краіне электрыфікавана больш за чвэрць магістраляў. Уладзімір Марозаў падзякаваў праекціроўшчыкам, будаўнікам, працоўным калектывам чыгуначных прадпрыемстваў і спецыялістам, якія займаліся ўстаноўкай і наладкай абсталявання, за неацэнны ўклад у будучыню беларускай магістралі.

— Вымяраць значэнне інвестпраекта нельга толькі матэрыяльна — за дзесяць гадоў электрыфікавана больш як 300 кіламетраў галоўных шляхоў, разгорнутая даўжыня — амаль 700 кіламетраў. У перспектыве таксама далейшая мадэрнізацыя інфраструктуры, — заўважыў начальнік Беларускай чыгункі.

Са знамянальнай падзеяй чыгуначнікаў і жыхароў рэгіёна павіншаваў Анатоль Сівак. Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі нагадаў, што на працягу ўсіх гадоў станаўлення сваёй незалежнасці беларуская дзяржава самыя значныя ўкладанні рабіла менавіта ў эканоміку, у мадэрнізацыю вытворчых магутнасцяў прадпрыемстваў. І транспарт у гэтым выпадку не выключэнне. Паводле слоў Анатоля Сівака, больш за дзесяць гадоў таму асноўным напрамкам развіцця для Беларускай чыгункі была выбрана электрыфікацыя. Просты чалавек можа бачыць толькі магутныя апоры і кантактны провад над пуцямі. Але насамрэч была праведзена грандыёзная работа, якая істотна змяніла аблічча чыгункі, дзе на змену цеплавозам прыйшлі электравозы. Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што Беларуская чыгунка развіваецца за кошт уласных сродкаў.

— Гэта вельмі важна. Жадаю, каб і ў далейшым былі рэсурсы для развіцця такога дастаткова складанага вытворчага арганізма, — падкрэсліў Анатоль Сівак.

На будынку вакзала станцыі Калінкавічы была адкрыта памятная дошка аб дні пуску першага цягніка на электрычнай цязе. Пасля гукавога сігналу на сімвалічным чорна-белым верставым слупе першы электрасастаў адправіўся ад перона. У першую паездку на новым электрацягніку ад станцыі Калінкавічы да станцыі Светлагорск адправіліся ветэраны і работнікі чыгункі, а таксама ўсе ахвотныя.

Дарэчы, рэгулярны рух электрацягнікоў не толькі звязаў Калінкавічы са Светлагорскам і Жлобінам, але і адкрыў прамы камфартабельны праезд з райцэнтра ў Мінск. Раней шлях ад Калінкавіч да сталіцы займаў да 6 гадзін, цяпер — тры з паловай.

Як было сказана, рэалізацыя праекта па выкарыстанні інавацыйнага рухомага саставу на электрыфікаваных участках накіравана на ўмацаванне транспартных сувязяў і актывізацыю Гомельскага, Магілёўскага і Мінскага рэгіёнаў, на павышэнне камфорту транспартных зносін, эфектыўнасць эканамічных сувязяў і мабільнасць насельніцтва.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Экс-перакладчык расказаў падрабязнасці затрымання Садама Хусейна

**У чацвер, 30 снежня, споўнілася 15 гадоў з дня пакарання былога прэзідэнта Ірака Садама Хусейна. Яго рэжым паў у красавіку 2003 года пасля ўварвання антыіракскай кааліцыі на чале з ЗША на падставе пошукаў зброі масавага паражэння, якую ў краіне так і не знайшлі.**

Амерыканскія ваенныя пры арышце Садама Хусейна выкарыстоўвалі нейкі ўсыпляльны парашок, расказаў PIA «Навіны» іракскі перакладчык, які супрацоўнічаў з амерыканцамі і пажадаў застацца ананімным з-за асцярогі за сваю бяспеку.

Паводле яго слоў, аб меркаваным месцазнаходжанні Хусейна данёс адзін са сваякоў яго ахоўнікаў. Затым гэтую інфармацыю праверылі, прасачыўшы за самім целаахоўнікам, які, як высветлілася, прывозіў экс-прэзідэнту прадукты. «Ніхто не ведаў, што гэта — ахоўнік прэзідэнта, аднак падазрэнні амерыканскіх ваенных выклікаў той факт, што гэты чалавек купляў на рынках самыя лепшыя тавары, прычым пэўных марак. Улічваючы сітуацыю ў краіне і ўмовы жыцця гэтага чалавека, гэта выклікала падазрэнні, за ім устанавілі сачэнне, у выніку чаго ўсё і высветлілася», — растлумачыў удзельнік падзей.

Пасля таго як Хусейна вывезлі на верталёце, перакладчык змог агледзець пакой, дзе той праждываў: гэта было памяшканне шырынёй 3,5 метра і даўжынёй каля чатырох метраў, дзе стаялі два ложкі. «Там было дарагое адзенне, духі і асабістыя рэчы — наручны гадзіннік прэзідэнта, некалькі фатаграфій яго сям'і, каштоўныя рэчы, быў яго асабісты рэвальвер», — расказаў суразмоўнік агенцтва. Большую частку асабістых рэчаў іракскага лідара — яго абутак, гадзіннік, адзенне і нават ежу — укралі.

Ён адзначыў, што ферма пасля аперацыі пакрылася «нейкім белым рэчывам», пры гэтым усе жывёлы загінулі.

## Адключэнне Расіі ад SWIFT стане праблемай для ўсіх

**Адключэнне Расіі ад міжнароднай міжбанкаўскай сістэмы SWIFT прынясе мноства праблем іншым краінам, заявіў міністр фінансаў РФ Антон Сілуанаў.**

«Гэта, вядома, можна зрабіць, але потым давядзецца ўсім разам шукаць інструменты, як інфармацыю аб гэтых транзакцыях адзін аднаму пастаўляць», — рэзюмаваў кіраўнік расійскага Мінфіна. Паводле яго слоў, такі крок перашкодзіць тысячам еўрапейскіх кампаній, якія актыўна гандлююць з Расіяй.

Раней СМІ паведамлялі, што Захад абмяркоўвае жорсткія санкцыі супраць Масквы з-за сітуацыі на ўсходзе Украіны, у ліку магчымых абмежаванняў называлі адключэнне ад SWIFT. У Расіі ў адказ на гэта стварылі сваю сістэму перадачы фінансавых паведамленняў. Пры гэтым у снежні агенцтва «Блумберг» пісала, што Захад лічыць гэтую меру праблематычнай.

SWIFT — міжнародная міжбанкаўская сістэма перадачы інфармацыі і ажыццяўлення плацяжоў, да якой падключана больш за 11 тысяч найбуйнейшых арганізацый амаль ва ўсіх краінах.

## Буш прызнаўся ў слабым разуменні міжнародных спраў



**Былы пасол Вялікабрытаніі ў ЗША Крыстафер Меер расказаў, што экс-прэзідэнт Злучаных Штатаў Джордж Буш-малодшы прызнаваўся яму, што слаба разбіраецца ў міжнародных справах. Словы Меера прыводзіць Daily Mail.**

Па яго словах, Буш зрабіў такую заяву на іх першай сустрэчы ў 1998 годзе, калі быў яшчэ губернатарам Тэхаса. «Буш прызнаў, што, за выключэннем Мексікі, ён мала што разумее ў міжнародных справах і што яму было б карысна пашырыць свой вопыт. Яго светапогляд у значнай ступені абмежаваны гарызонтамі Тэхаса і Мексікі», — сказаў Меер.

# 2021-ы: МЫ МНОГАЕ ЗРАЗУМЕЛІ. ПРА ІНШЫХ І ПРА СЯБЕ

**Вынікі ўжо мінулага года падводзіць надзвычай складана і цікава. Складана — бо столькі ўсяго важнага ў жыцці краіны, а значыць, і ў нашым з вамі, было, што баішся штосьці ўпусціць. Цікава з той жа прычыны, але яшчэ і таму, што проста на вачах мянялася наша грамадства. Гэты год для многіх з нас стаў адкрыццём, мы шмат зразумелі пра тое, што адбываецца ў краіне і вакол яе, мы шмат зразумелі пра саміх сябе, мы ўбачылі, чаго каштуе спакойнае жыццё на сваёй зямлі, па сваіх, а не прадыктаваных аднекуль правілах і законах. Мы перасталі быць раўнадушнымі, мы пачалі разумець, што ва ўсіх палітычных і эканамічных сучасных варунках размова ідзе ні больш ні менш як пра існаванне нашай маладой краіны на карце свету.**

**Усё гэта за адзін год? Складана. Але ж беларусы не шукаюць лёгкіх шляхоў. Мы ў свой час за першае дзесяцігоддзе існавання краіны займелі свае ўніверсітэты і нацыянальную Акадэмію навук — на што многім народам спатрэбіліся стагоддзі. А за апошнія дваццаць пяць гадоў пабудавалі моцную незалежную дзяржаву, якая не пахіснулася пад націскам усіх няпростых падзей 2020-га, якая працягвае паспяхова трымаць абарону і ў 2021-м... Гэты год быў няпросты і цікавым. Тыя моманты, якія згадаем у гэтай публікацыі — яго важныя этапы, дзякуючы якім мы сустракаем Новы год з упэўненасцю ў сабе і ў краіне, у якой маем шчасце жыць.**

## Усебеларускі народны сход

Хоць падобнае знакавае паводле вызначэння мерапрыемства было шостае па ліку, многія аналітыкі па значнасці параўноўвалі яго з першым Усебеларускім народным сходам, калі вызначаўся шлях, па якім пойдзе маладая дзяржава Беларусь. «2021 год — мяжа: па сваёй лёсавызначальнасці ён супастаўны з вяхамі пачатку XX стагоддзя і сярэдзіны 1990-х гадоў. Але ў адрозненне ад тых смутных часоў, сёння ў нас ёсць разуменне сітуацыі і план дзеянняў, які дае ўсе шанцы на паспяховае развіццё», — сказаў падчас выступлення на сходзе Прэзідэнт.

Па выніках сходу была абазначана галоўная мэта на пяцігодку — забяспечыць сацыяльную стабільнасць у грамадстве і павелічэнне дабрабыту грамадзян дзякуючы якаснаму росту эканомікі, нарошчванню сацыяльнага капіталу, стварэнню камфортных умоў для жыцця, работы і самарэалізацыі. Ключавыя задачы — скараціць залежнасць эканамічнага росту ад вуглевадароднай сыравіны, павялічыць экспартны патэнцыял за кошт высокатэхналагічных тавараў, запусціць новы інвестыцыйны цыкл.

Прыярытэты пяцігодкі — шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр.

А галоўная ідэалогія развіцця Беларусі на будучыню была закладзена ў дэвізе, пад якім праходзіў сход, — «Адзінства. Развіццё. Незалежнасць».

## Барацьба з ковідам

У той час як па ўсім свеце ўспыхвалі пратэсты супраць рознага кшталту ковідных абмежаванняў, Беларусь упэўнена ішла сваім шляхам, нягледзячы на крытыку з боку апанентаў, якая пачалася з першай хвалі, калі краіна не згразла ў лакдаўне, чым фактычна выратавала сваю эканоміку. Гэтай восенню на самым высокім узроўні было забаронена абавязваць людзей да нашэння масак і да вакцынацыі — ці не самае гэта яскравае сведчанне свабоды чалавека як асобы? Як вынік — краіна пазбегла сацыяльнай «ковіднай» напружанасці, эканоміка працуе на плюс, медустановы справіліся з нагрузкай, хваля эпідэміі спадае, колькасць вакцынаваных набліжаецца да паловы насельніцтва. З навін канца года — у Беларусі выпусцілі доследныя серыі расійскіх вакцын «Спутнік» па поўным цыкле. Ідзе работа і над распрацоўкай уласнай беларускай вакцыны.

## Санкцыі і міграцыйны крызіс

Тое, што нас не забівае, робіць нас мацнейшымі. У праўдзівасці гэтага выразу беларусы ў 2021-м пераканаліся на ўласным вопыце. Хоць тым, хто ўводзіць санкцыі ў адносінах да нашай краіны, хацелася б, каб было дакладна наадварот. Дзякуючы своечасовай пераарыентацыі экспарту, дзякуючы рабочым прадпрыемстваў, якія не паддаліся на заклікі да забастоўкі, мы вытрымалі. Так, складана, і працсей не будзе, папярэджвае Прэзідэнт і ставіць кіраўніцтву краіны задачу: ні ў якім разе ад санкцый не павінны пацярпець простыя людзі. Не варта перажываць і за тое, што спажыўцы акажуцца абдзеленымі нейкімі заморскімі далікатэсамі з-за эмбарга, якое Беларусь увяла на тавары з недружалюбных краін у адказ на санкцыйны ціск. Па-першае, ёсць шмат краін дружалюбных, у якіх тыя самыя тавары можна купіць. Па-другое, мацарэлу ўжо выдатна навучыліся рабіць у Тураве, а фуа-гра — пад Стоўбцамі. Было б жаданне — магчымасці знойдуцца.

Міграцыйны крызіс на мяжы з Еўрасаюзам стаў таксама выпрабаваннем для нашай краіны. Тыя, хто прычыніўся да наплыву бежанцаў, хто стварыў на іх радзіме перадумовы для гэтага наплыву, у найлепшым выпадку стаялі ўбаку і назіралі, як Беларусь справіцца, у горшым — збівалі і нават забівалі няшчасных людзей, выкідваючы іх целы на беларускую тэрыторыю.

Мы справіліся. І ў гэтай сітуацыі на ўсіх узроўнях здалі свой галоўны цывілізацыйны экзамен — на чалавечнасць.


Фота БелТА.

## Праверка на сяброўства

2021 год для многіх з нас стаў часам адкрыццяў і расчараванняў. Як заўсёды бывае ў няпростыя перыяды, з людзей пачынае «вылазіць» іхняя сапраўдная сутнасць, усе найлепшыя або найгоршыя рысы. Стала зразумела, хто сапраўдныя сябры, а хто проста знаёмыя, якія ў любы момант падставяць ножку і яшчэ штурхануць, каб ужо дакладна паваліўся.

Прычым гэта стала яскрава відаць не толькі на асабістым, але і на міждзяржаўным узроўні. У нейкім сэнсе нават добра, што так яно — і ў асабістым, і ў міждзяржаўным — здарылася. Затое цяпер дакладна ведаем, хто нам хто.

## Супрацьстаянне фэйкам

Пагадзіцеся, многія з нас яшчэ два гады таму нават слова такога не чулі — фэйк. І калі ў 2020-м яны на нас абрынуліся — мы былі проста ў шоку. Яўная непрыкрытая хлусня падавалася як праўдзівая інфармацыя, і супрацьпаставіць ёй штосьці ў тым жа масіве і з падобнай эмацыянальнай падачай здавалася немагчымым.

Але шок мінуў, і высвятлілася — супрацьпаставіць хлусні можна толькі праўду. Асабліва выразна гэта стала зразумелым пасля затрымання небезвядомага Рамана Пратасевіча, калі на Захадзе ўзняўся лямант аб нечалавечых катаваннях няшчаснага арыштанта. Усе «бясспрэчныя факты» разбіліся ўшчэнт, літаральна праз два дні перад журналістамі паўстаў сам Раман — усмешлівы, гаваркі і зусім не пабіты. Некаторыя заходнія журналісты не вытрымалі такой ганьбы для сябе і ўцяклі з залы.

Гэта быў моцны крок, але яшчэ мацнейшым стала «Вялікая размова з Прэзідэнтам». На працягу васьмі гадзін у прамым эфіры кіраўнік дзяржавы адказваў на ўсе пытанні, нават самыя правакацыйныя і нявыгадныя. Гэта быў сапраўдны момант ісціны для многіх, у тым ліку і жыхароў Беларусі. Пасля было «зацвярджэнне матэрыялу» — столькі інтэрв'ю замежным СМІ, прычым і з Захаду, і з Усходу, як у 2021-м, Аляксандр Лукашэнка не раздаваў ніколі. А яго славутае «Факты на стол!» для нас саміх стала дэвізам у адносінах да няправеранай інфармацыі.

## «Лічбавая» адказнасць

Менавіта ў 2021-м многія з нас пачалі разумець, што віртуальная рэальнасць — усё ж рэальнасць, што інтэрнэт і сацыяльныя сеткі — публічная прастора. І як прыстойныя людзі не брыдкасловяць і не раздзяваюцца дагала на вуліцы, так і там павінна быць. Калі ты абразіў чалавека публічна, калі распаўсюдзіў яго прыватную інфармацыю без яго згоды — гэта цягне адказнасць па законе, няважна, зрабіў ты гэта ўжывую ці ў сеціве.

Для многіх гэта было адкрыццём і выклікала неразуменне: маўляў, за што, за бяскрыўдныя гульні? Але ў тых, каго гэтыя «гульні» зачапілі асабіста, гэтых пытанняў не ўзнікала. Як і ў праваахоўных органаў, якія ў падпісчыкаў інтэрнэт-суполак знаходзілі рэальную зброю і складнікі для «кактэйляў Молатава»...

## Дзень народнага адзінства

У 2021-м, аб'яўленым на дзяржаўным узроўні Годам народнага адзінства, у нашым календары з'явіўся адметны дзень. Думка аб тым, што ён патрэбны нашаму грамадству, прагучала на Усебеларускім народным сходзе. Дата 17 верасня, якую вызначылі для новага дзяржаўнага свята, ні ў аднаго чалавека, які лічыць сябе патрыётам Беларусі, не выклікае і ценю сумнення. Гісторыкі лічаць, што па значнасці для Беларусі як краіны, для беларусаў як народа яна саступае толькі даце 3 ліпеня, якая знамянуе вызваленне ад фашысцкай навалы.

Для многіх з нас гэта нагода заняцца вывучэннем уласнай гісторыі. Бо што мы ведалі пра 17 верасня, акрамя таго, што вуліцы з такой назвай ёсць у кожным заходнебеларускім мястэчку? А пачаўшы цікавіцца гісторыяй менавіта з нашай, беларускай, пазіцыі, шмат што іншае можна зразумець.

## Змяненні ў Канстытуцыю

Грамадства выспела для перамен. Улада грамадства пачула і адказала: «Перамены будуць». Але — паступовыя, эвалюцыйныя, каб не загубіць тое добрае, што чвэрць стагоддзя ўсе разам будавалі. Усіх разам дзяржава запрашае і выбудаваць новую рэдакцыю Асноўнага Закона. Змяненні і дапаўненні ўнесліся ў новы праект пасля абмеркавання на дыялогавых пляцоўках па ўсёй краіне. І гэта яшчэ не фінальны этап: праект зноў вынесены на абмеркаванне, у нас яшчэ раз пытаюць: ці ёсць заўвагі і прапановы? Чарговы раз падкрэсліваючы: мы ўсе разам і кожны паасобку адказваем за будучыню краіны, у якой жывём. Вялікі гонар, але і вялікая адказнасць. Калі большасць гэта прыме і зразумее — у нас усё абавязкова будзе добра.

Звычайныя цуды

# УСЁ Ў НАС АТРЫМАЕЦЦА!..

## Як медыкі дапамагаюць здзейсніцца самаму запаветнаму

**Праводзячы мінулы год, кожны з нас згадвае падзеі, якія былі важнымі, ацэньвае ўласныя дасягненні і робіць высновы: удалы быў год ці не вельмі. Поспехі і няўдачы, набыткі і страты, хваробы — станоўчае мы запісваем сабе на рахунак, ну і дзякуем Усявышняму, што ўсё непрыемнае, нарэшце, мінула... Гэтыя жанчыны, як і сотні іншых, упрыгожылі навагоднюю ёлку, прыгатавалі святочны стол і апоўначы загадаюць жаданні, сярод якіх, хутчэй за ўсё, будзе самае запаветнае — каб тое, што адбылося з імі ў 2021-м, ніколі не паўтарылася. А магчыма, яны проста пастараюцца не ўспамінаць горшае: самае галоўнае, што сталі мамамі, а тое, што атрымалася гэта зусім не проста, цяпер не важна. Але можна не сумнявацца ў адным — кожная з іх бясконца ўдзячная тым людзям, якія выратавалі ім жыццё. Наш сённяшні матэрыял не пра хваробы, а пра тое, што цуды магчымыя, і людзі, якія дапамагаюць ім здзейсніцца, заўсёды побач.**



Загадчык аддзялення рэанімацыі Алег ФРАЛОЎ.

### Калі сітуацыя нестандартная...

Сярод тысяч пацыентак аднаго з самых буйных у краіне радзільных дамоў, які знаходзіцца на базе 5-й сталічнай бальніцы (штогод на свет тут з'яўляецца больш за пяць тысяч дзяцей), ёсць тыя, чыё мацярынства стала магчымым дзякуючы выключнаму прафесіяналізму медыкаў. Для Вольгі Т. (імёны жанчын зменены) жаданая цяжарнасць ператварылася ў выпрабаванне з першых тыдняў. Такая своеасаблівая (і досыць распаўсюджаная ў першым трыместры) рэакцыя арганізма, як таксікоз, не праходзіла ні праз тры, ні праз чатыры, ні праз пяць месяцаў. Сітуацыя, наадварот, з часам толькі пагаршалася. На трыццаць другім тыдні цяжарнасці жанчына ўвогуле не магла есці. А паступова рвоту пачала выклікаць і любая вадкасць, нават вада.

— Пацыентка паступіла да нас з так званай нястрымнай ірвотай цяжарных і вялікім дэфіцытам масы цела — яна важыла ўсяго 48 кілаграмаў. Была выражаная анарэксія, жанчына не магла не толькі есці, нястрымная рвота пачыналася нават пры мінімальным прыёме вады, — згадвае **урач-анестэзіёлаг-рэаніматолаг, загадчык аддзялення анестэзіялогіі, рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі гінекалагічных і родавых аддзяленняў 5-й гарадской клінічнай бальніцы Алег ФРАЛОЎ.** — Растлумачыць такі стан і знайсці яго арганічную прычыну складана, стройнай тэорыі ў навукоўцаў няма. Ірвота ўзнікае ў адказ на прыём ежы, аўтаматычна чалавек ад яе адмаўляецца, фарміруецца рэфлекторны ланцужок. Мы прынялі рашэнне перавесці пацыентку на парэнтэральнае харчаванне — праз кропельніцу.

Нягледзячы на тое, што жанчына, трапіўшы ў бальніцу, ацэньвала свой стан не так і дрэнна, змены ў аналізах сведчылі, што сітуацыя нестандартная і ў любы момант можа стаць крытычнай. Аднак і харчаванне праз кропельніцу аказалася не такім лёгкім рашэннем. Пры сваіх параметрах пацыентка магла атрымліваць не больш за 1 800 мл раствору ў суткі. Але ўлічваючы вялікі дэфіцыт масы цела, змясціць у гэты аб'ём неабходную колькасць калорый, вадкасці і амінакіслот аказалася той яшчэ задачай для медыкаў.

— З такім вялікім дэфіцытам вагі цяжка падабраць інфузійную праграму, улічваючы тое, што цяжарным многае супрацьпаказана. Вырашалі праблему павелічэннем канцэнтрацыі раствораў, пільным апаратным кантролем, — кажа Алег Фралоў.

У выніку ва ўрачоў усё атрымалася. У пэўны тэрмін, калі жыццю дзіцяці ўжо нічога не пагражала, жанчыне было зроблена кесарава сячэнне. Сама яна хутка папраўлялася, змагла вярнуцца да нармальнага рэжыму харчавання. Праз некалькі месяцаў з рэанімацыі было выпісана і набраўшае вагу немаўля. Сёння, гледзячы на гэтую шчаслівую сям'ю, наўрад ці можна здагадацца, праз што ім давялося прайсці.

Настасся А. трапіла ў рэанімацыйнае аддзяленне з вострым панкрэатытам цяжарных на 28-м тыдні. Ён здараецца ў будучых мам з-за сціскання ўнутраных органаў. Аднак у дадзеным выпадку стан таксама быў цяжкім.

— Падстраўнікавая залоза — орган далікатны і адчувальны, да таго ж няпарны — замены яму няма. Парушэнне яго функцый вядзе да істотнай гармanальнай перабудовы, панкрэатыту, болевага шоку. Пацыентка была цяжкая, у яе пачала развівацца дэкампенсацыя па функцыі нырак і печані, — расказвае Алег Фралоў.

Аднак і з гэтай сітуацыяй медыкі справіліся. Праз колькі тыдняў стан маладой жанчыны ўдалося палепшыць настолькі, што не вырашана было адпусціць дадому, дзе яна і знаходзілася да родаў.

— Асаблівасць будучых мам у тым, што яны, як правіла, недаацэньваюць цяжар свайго стану, — адзначае загадчык аддзялення рэанімацыі раддома. — Падчас цяжарнасці напружваюцца ўсе сістэмы арганізма, і калі ў жанчыны маюцца нейкія хранічныя хваробы, яны пачынаюць праяўляць сябе. Аднак трэба аддаць належнае той сістэме вядзення цяжарных жанчын, якая ў нас існуе. Нідзе ў свеце няма такога пільнага назірання цяжарнасці і такіх адносін да жанчыны і дзіцяці пасля родаў. У многіх, нават развітых, краінах іх выпісваюць дадому на наступны дзень, не існуе там і паняцця дэкрэтнага водпуску — мама працуе, а дзіця дагледзе нянька, што таксама не надта добра.

### Многае вырашае абсталяванне

Падобныя нестандартныя і складананыя выпадкі прадбачыць і спрагназаваць немагчыма, але медыкі да іх добра падрыхтаваныя. Варта адзначыць, што радзільны дом 5-й сталічнай бальніцы з'яўляецца адным з найлепш аснашчаных у Беларусі. Тут маецца самая сучасная апаратура для пералівання крыві, у тым ліку хуткага замяшчэння яе аб'ёмаў — яна дазваляе ўліваць раствор з хуткасцю да 500 мл у хвіліну. Прычым ён падаецца падагрэтым, з-за чаго пацыентка не пераахалоджваецца. Ёсць абсталяванне для хуткай дыягностыкі парушэнняў сістэмы згусання крыві. Выстаўляецца такі папярэдні дыягназ усяго за 10 хвілін — у той час, калі пацыентка на аперацыйным стале. Апаратура для рэінфузіі крыві дазваляе адкачаць з арганізма ўласную кроў пацыенткі пры назапашванні яе, скажам, у брушной поласці, сепарыраваць у спецыяльным апараце і вярнуць у кровазварот. У параўнанні з метадам пералівання гэта больш складаная і затратная працэдура, аднак для пацыенткі куды больш ашчадная.

Усе аперацыйныя радзільнага дома таксама аснашчаны на самым сучасным узроўні — дыхальныя апараты высокага класа, маніторынг стану пацыента адпавядае еўрапейскім стандартам. Пры неабходнасці праводзіцца BIS-маніторынг, што дазваляе вызначыць глыбіню седацыі і нават стадыю наркозу. Маніторынг асноўных паказчыкаў гемадынамікі, як і дыхання, праводзіцца па еўрапейскіх стандартах. Абсталяванне для хуткай інфузіі крыві, падагрэву раствораў, тэрмафены дазваляюць падчас аперацыі пазбегнуць развіцця тромбагемарагічнага сіндрому і іншых непрыемных наступстваў.

Усе мы ведаем, што абследаванне і падрыхтоўка да планавай аперацыі могуць заняць не адзін тыдзень. Калі ў аперацыйную трапляе экстранная пацыентка, гэтага часу няма. Яе падрыхтоўка ідзе літаральна на аперацыйным стале і разам з правядзеннем усіх неабходных лабараторных аналізаў займае не больш за 20 хвілін згодна са стандартамі.



Рэанімацыйныя палаты, на жаль, не пустуюць.

### Узровень адказнасці — удвоены

— У экстраннай сітуацыі няма часу на лішнія думкі і перажыванні, усё робіш хутка, дакладна і аўтаматычна, — кажа **медыцынская сястра-анестэзіст Дар'я БРЫКУН.**

— Больш за тое, такая работа зацягвае, і я не бачу сябе ні ў якім іншым аддзяленні, — дадае яе калега **Яўгенія ГАНЧАРОВА.**

Абедзве медыцынскія сястры-анестэзісты ў медыцыне нядаўна, Яўгенія працуе другі год, Дар'я — шосты. Падчас вучобы ў медыцынскіх каледжах дзяўчаты марылі аб рабоце ў анімацыйных аддзяленнях і атрымалі туды размеркаванні.

— Для работы ў акушэрстве важна, па-першае, знаходзіць агульную мову з цяжарнымі жанчынамі і паводзіць сябе карэктна, па-другое, умець працаваць у камандзе, па-трэцяе — усведамляць свой узровень адказнасці. А ён удвоены — мы адказваем не толькі за жыццё маці, але і за немаўля, — лічыць Алег Фралоў.

Таму ў такіх аддзяленнях не ўсе медыкі затрымліваюцца надоўга — тыя, каму гэта работа не падыходзіць, рана ці позна сыходзяць у больш спакойныя месцы. Сёння ў аддзяленні працуе 15 урачоў, тры інтэрны і тры дзясяткі медыцынскіх сясцёр.

Алег Фралоў аддаў медыцыне больш за чатыры дзесяцігоддзі. У 1977 годзе ён пачынаў санітарам у брыгадзе хуткай дапамогі, пасля заканчэння медінстытута ў 1989-м працаваў у розных установах аховы здароўя, з 2010 года загадвае рэанімацыйным аддзяленнем у 5-й бальніцы. Актыўна перадае свой вопыт маладому пакаленню ўрачоў — штогод пад яго кіраўніцтвам удасканальвае свае навыкі некалькі інтэрнаў.

* * *

**Паднімаючы ў навагоднюю ноч бакал з шампанскім, успомніце і падзякуйце медыкам за выратаванае здароўе — сваё ці вашых блізкіх. Памятайце, што цуды магчымыя, а людзі, якія дапамагаюць ім здзейсніцца, могуць зараз стаяць каля аперацыйнага стала. Ці проста папраўляюць падушку камусьці ў рэанімацыі — каб яму стала крыху лягчэй.**

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

---

Мясцовы час

# ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І МІЛАСЭРНАСЦЬ

## з пакалення ў пакаленне

**Браслаўская цэнтральная раённая бальніца адзначыла сваё 115-годдзе. Юбілейную дату браслаўчане святкавалі ў раённым цэнтры культуры. Медыцынскіх работнікаў прыехалі павіншаваць кіраўнікі раёна і вобласці, дэпутаты, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.**

— Захаванне гістарычнай памяці на Браслаўшчыне, перадача добрых традыцый з пакалення ў пакаленне заўсёды мелі асаблівае значэнне, — сказаў **старшыня Браслаўскага раённага выканаўчага камітэта Вячаслаў ГРЫШЧАНКА.** — Раённая бальніца — адзін з яскравых прыкладаў. Тут здолелі выхаваць не адно пакаленне медыкаў: ад урачоў — прызнаных аўтарытэтаў да дасведчаных медыцынскіх сясцёр. Вельмі прыемна, што традыцыі, закладзеныя папярэднімі пакаленнямі прафесіяналаў, не толькі захоўваюцца, але і прымнажаюцца.

Кіраўнік раёна заўважыў, што сёння Браслаўская раённая бальніца адпавядае ўсім патрабаванням, укамплектавана сучасным абсталяваннем і кваліфікаванымі кадрамі.

Падчас мерапрыемства шэраг медыцынскіх супрацоўнікаў атрымалі ўзнагароды і падзякі. Так, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь» узнагароджаны ўрач-неўролаг загадчык неўралагічнага аддзялення Ігар Козел, а ганаровымі граматамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь — намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі Святлана Аляксеева і загадчык кабінета ўльтрагукавой дыягностыкі Аляксандр Швед. Падзякі ад міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь атрымалі медыцынская сястра прыёмнага аддзялення бальніцы Аксана Зуева і ўрач-стаматолаг стаматалагічнага аддзялення паліклінікі Тэрэса Радзюль.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ЧАРАЎНІЦА ІЗУМРУДНАГА ГОМЕЛЯ

**Каляднымі цацкамі-цукеркамі, ядомымі творамі мастацтва пакарае сэрцы гамяльчан чараўніца ізумруднага пераднавагодняга Гомеля. На сваім прыкладзе яна расказвае, як правільна загадаць жаданне пад Новы год: прафесійна развіцца праз хобі, прайсці шлях ад беспрацоўнай да самазанятай, а салодкія вырабы ператварыць у творы аўтара-кандытара.**

Кухар, тэхнік-тэхнолаг харчовай вытворчасці гамяльчанка Кацярына ЧУВАШАВА да Каляд рыхтуе салодкія боксы. У драўляныя скрыначкі, зробленыя ўручную, закладвае «бомбы». Гэта крафтавыя шакаладныя шары з самай неверагоднай начынкай, якая ўражвае выбухам смачных кактэйляў. Гэтыя шакаладныя бомбы-шары — тая яшчэ «дыверсія»: паспрабуй дачакацца свят і не з'еш! Маскіраваць ад дзяцей іх можна пад навагоднія цацкі. Шакаладныя шары і цукеркі цяжка адрозніць ад дэкаратыўных вырабаў — хоць ёлку упрыгожвай.

— У свой час атрымала прафтэхадукацыю па спецыяльнасці «кухар», потым — сярэднюю спецыяльную — тэхніка-тэхнолага. Паступіла ва ўніверсітэт, марыла займацца маркетынгам, паралельна працавала кухарам, — расказвае пра сябе Кацярына. — Я была цяжарная дачушкай, калі на рабоце скарацілі людзей, і я ў тым ліку стала беспрацоўнай. «Кухара з жыватом» браць на работу ніхто не хацеў. Менавіта тады любоў да прыгожага, імкненне ствараць нешта незвычайнае, крэатыўнае мяне літаральна выратавала. Я паспрабавала сваімі рукамі вырабляць дзіцячыя ўпрыгажэнні для валасоў, атрымалася вельмі добра. Пачала працаваць як рамеснік.

Расказвае майстрыха, і як «лёс шчоўкнуў па носе»: мама дзяўчыны ўсё жыццё прапрацавала кандытарам у вытворчым цэху. Сама ж Кацярына заўсёды падкрэслівала, што не пойдзе, як маці, у кандытары, работа аднатыпная — лісточкі ды ружачкі з крэму будуць сніцца па начах. Ды вось як выйшла.

— Паспрабавала рабіць спачатку торцікі, цікавілася аздабленнем кандытарскіх вырабаў. Потым для родных і сяброў зрабіла першыя цукеркі сваімі рукамі, шакаладкі з рознымі начынкамі, шакаладныя бомбы і так захапілася, — дзеліцца дзяўчына. — Брала ўдзел у хэнд-мэйд-выставах: прадстаўляла аўтарскія ўпрыгажэнні для валасоў і свае «салодкія работы». Там пазнаёмілася з гамяльчанкай, якая жыве ў Германіі. Яна была настолькі ўражаная маімі салодкімі боксамі з аўтарскімі вырабамі, што заказвала іх для ўсіх сваіх нямецкіх сваякоў і знаёмых. Маўляў, праз мае цукеркі можна расказаць пра Гомель, Беларусь. Казала, што не сустрэнеш такога ў іх.



Увогуле праз работу ў яе жыццё прыйшло шмат цікавых людзей — у іх вучылася, развівалася як мастак-кандытар. Сёння Кацярына рыхтуецца да афармлення сваёй «салодкай справы» ў статусе ўжо не рамесніка, а самазанятага. Яе такая магчымасць працаваць вельмі цікавіць, лічыць, што за гэтым будучыня.

— Хачу сказаць, што калі ты паглыбляешся ў модныя перадавыя тэхналогіі, ідзі «крафтавых ласункаў», то бачыш, што самыя прызнаныя, найлепшыя ў свеце ў гэтай тэме — якраз кандытары з Расіі і Беларусі, — адзначае Кацярына.

Расказвае яна і аб тым, як мяняюцца разуменне і адносіны людзей да салодкіх вырабаў ручной работы з «празрыстым» складам. Па яе назіраннях, большасць людзей падкупляе не сам натуральны склад цукерак ці шакаладак, а прыгажосць. Многія перадаюць аўтару пасля, што такія вырабы шкада было есці. Некаторыя прызнаюцца, што прыгожае раней успрымаў як штучнае — тое, што мы называем «хімія». Кацярына мяняе стэрэатыпы.

У яе свой стыль у падыходзе да інгрэдыентаў. У складзе салодкіх твораў толькі натуральны шакалад, але ні ў якім разе не глазура. Яна не выкарыстоўвае замяняльнікі, узмацняльнікі смаку, танныя неправерваныя фарбавальнікі. Кажа, сёння ў продажы ёсць усё неабходнае для развіцця такой вытворчасці. Кацярына шмат эксперыментуе з начынкамі для шакаладу з розных відаў арэхаў, сухафруктаў, зефіру, нугі. Для яе гэта невычарпальнае поле для ўдасканалення сябе як майстра. Вельмі папулярныя шакаладныя «бомбачкі», якія ў малацэ, какаве ці вадзе паступова растаюць і раскрываюць розныя начынкі. Асабліва падабаецца такое дзецям.

— Мае кліенты робяць заказ, я прашу даверыцца мне — кожная цукерка ці крафтавая плітка шакаладу выходзіць унікальнай. Людзі прыходзяць зноў і зноў. Для мяне гэта вельмі важна, — дзеліцца Кацярына. — У мяне няшмат кліентаў. Але на такой дзейнасці цяжка зарабіць вялікія грошы, асабліва адразу.

Для яе ўласная жыццёвая гісторыя — гэта пра мастацтва, прыгажосць і пра тое, што калі ты творчы чалавек, ты можаш самастойна рэалізоўваць сябе, спрабаваць, не баяцца, што застанешся без работы ці без заробку.

— Мая дачушка, якой цяпер шэсць гадкоў, імкнецца мне дапамагаць, ганарыцца мной. Неяк назірала за маёй работай, а потым кажа: бачу, што гэта цяжка, але таксама вельмі хачу стаць кандытарам, калі выраслу. Ганарыцца мной і мой любімы муж. Памяняла меркаванне і мая мама, якая спачатку вельмі перажывала, як





гэта кандытар працуе без цэха — дома, рызыкуе быць самазанятым, разлічваць на сябе.

Майстар-кандытар расказвае, што для яе вельмі важна любіць усё ў сваёй рабоце, шанаваць і канкурэнтаў. Кацярына, калі бачыць у сацыяльных сетках добрага «крафтавага» кандытара з годнымі вырабамі, абавязкова ў сваім профілі робіць спасылкі на аўтара, рэкамендуе людзям, імкнецца падтрымаць майстра.

— Здараюцца і кур'ёзы ў маёй «салодкай» справе, — расказвае гамяльчанка. — Калі быў папулярны расійскі тэлесерыял пра кандытара-індывідуальнага прадпрымальніка Пірагову, мае суседкі, паважанага ўзросту жанчыны, наглядзеўшыся кіно з унукамі ці дзецьмі, ахрысцілі мяне таксама Піраговай, трохі кпілі спачатку. Жартавалі, што хутка можна будзе і ў нас на раёне зняць такую кінастужку. Мне самой ідэя вельмі падабаецца, кансультацыі кандытараў нават не аднаго пакалення — гарантуем!

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва гераіні.**

Надвор'е

## МОКРЫ СНЕГ, ЯКІ БУДЗЕ ПЕРАХОДЗІЦЬ У ДОЖДЖ

### На святы нам не шанцуе: на працягу двух галоўных сутак года — туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца

**Гэта нават не сюрпрыз, да такога мы ўжо прывыклі. У апошні дзень адыходзячага года і ў пачатку новага ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты, за якімі да нас накіруецца цёплае паветра. І ў гэты сезон, на святы, на змену зімовым маразам прыйдуць адлігі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сіноптыкі адзначылі, што ў найбліжэйшыя дні на дарогах варта быць вельмі ўважлівымі як кіроўцам, так і пешаходам — бачнасць будуць пагаршаць туманы, а пад нагамі будзе слізка.

У апошні дзень года (31 снежня) часам пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які пераходзіць у дождж. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца туман. Прагназуецца слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўдзень будзе 1—7 цяпла, па ўсходзе ад нуля да мінус 2 градусаў.

У суботу, 1 студзеня, часам пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У навагоднюю ноч і раніцай месцамі па краіне чакаецца туман, слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Удзень месцамі па паўднёвым захадзе прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 6 градусаў. У галоўную ноч у Мінску — да плюс 3 градусаў і дождж. Удзень будзе ад мінус 1 градуса па паўночным усходзе, да 8 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

А вось у другі дзень студзеня, у нядзелю, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовы снег і мокры снег. Удзень па паўднёвым захадзе краіны прагназуецца кароткачасовы дождж, месцамі галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны з пераходам на паўднёвы ўмераны, уначы месцамі парывісты. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 1 па поўдні да мінус 11 градусаў па поўначы краіны. Удзень будзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па паўднёвым захадзе 1—3 цяпла.

На гэтым часовае актыўнае пахаладанне скончыцца. З панядзелка зноў чакаецца адносна цёплае для пачатку студзеня надвор'е. У трэці дзень года на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі прагназуецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да плюс 3 градусаў, па ўсходзе да мінус 8. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да плюс 5, у паўднёва-заходніх раёнах да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, мокры снег з дажджом будзе ісці і ў аўторак. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, пры праясненнях да мінус 6. Удзень будзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДВОЕ — ГЭТА НЕ ЗАНАДТА!

## Як сям'я таксістаў сустракае Новы год

**Новы год і Каляды — святы, якія прынята адзначаць дома, у коле родных і блізкіх. Але жыццё не замірае нават у самую чароўную ноч у годзе, і ёсць людзі, якія працуюць гэтымі днямі. Таксісты, дарэчы, часам вельмі нават задаволены работай у навагоднюю ноч. Не сакрэт, што ў святочныя дні тарыфы на перавозку ў таксі значна павышаюцца. З'яўляецца выдатная магчымасць зарабіць больш. Але грошы — не адзінае, што хвалюе людзей гэтай прафесіі.**

Незвычайная сям'я таксістаў Наталлі і Паўла расказала аб асаблівасцях жыцця прадстаўнікоў такой прафесіі, пра тое, як ставяцца беларусы да таксістаў-жанчын, а таксама пра тое, якія святы яны лічаць не выгаднымі, а любімымі.

### У БЕЛАРУСЬ ПРЫВЯЛО... КАХАННЕ

**Наталля:** Я вырасла ва Украіне. Закахалася ў беларуса і паехала за ім. Мы з мужам аселі ў Гродне. Гэты горад не такі вялікі і яркі, як Кіеў, але затое ён утульны і зялёны. Там, у Гродне, я нарадзіла сваю цудоўную дачку. Працавала тады ў розных месцах, займалася PR, нават, была экскурсаводам... Але праз некалькі гадоў сумеснага жыцця мы з мужам зразумелі, што нам далей не па дарозе. Развіталіся, і неўзабаве я прыняла рашэнне прыехаць у Мінск. Гэта было няпроста, бо ў выніку я засталася ў чужой краіне з дзіцем на руках. Мне здавалася, што ў сталіцы работы больш, і я хутка знайду сябе ў гэтым горадзе. Але Мінск не песціў мяне спачатку. За фасадамі вакансій хавалася не зусім прыдатная работа для маці-адзіночкі. Мне патрэбны быў графік, які б дазваляў вазіць дзіця ў садок, і пры гэтым заробак на арэнднае жыллё, садок і харчаванне... Аказалася, гэта практычна немагчыма. Я амаль страціла надзею, як раптам знаёмыя прапанавалі паспрабаваць сябе ў таксі. І я адважылася, бо ў



мяне якраз былі правы кіроўцы і патрэбны досвед.

> **«У таксі ёсць паслуга «цвярозы кіроўца», і вось там усякае бывае. Часам вельмі крыўднае. Не вельмі любяць мужчыны пускаць за руль свайго аўто жанчыну».**

**Павел:** Я ўжо працаваў у таксі некалькі гадоў. Звычайна мае калегі — мужчынская кампанія. І вось да нас прыйшла Наталля. Было зразумела, што яна прыйшла ў таксі вымушана. Выглядала крыху разгубленай. Мяне папрасілі дапамагчы дзяўчыне асвоіцца ў горадзе, расказаць ёй аб тонкасцях работы ў таксі. Так я стаў яе настаўнікам. Для Наталлі работа ў таксі была проста выратаваннем, таму што графік вольны — завозіць і забіраць малую з дзіцячага садка магчымасць ёсць, на бальнічныя, якія з дзецьмі здараюцца часта, адпускаюць свабодна, ну і зарплата здзельная. Гэта значыць, скончыліся грошы — выехаў, папрацаваў, і ўжо нешта ёсць у кішэні. Але ж калі хочаш арэндаваць жыллё, плаціць за дзіцячы садок і нешта есці, трэба працаваць і па 16 гадзін. Гэта вельмі цяжка, таму ў таксі так мала жанчын.

### ПАЦАЛУНАК У АЎТО

**Павел:** Насамрэч таксісты не увесь час за рулём. У нашай службы ёсць база, дзе кіроўцы сустракаюцца і могуць разам выпіць кавы. Ёсць і чаты, дзе можам паміж сабой размаўляць. Мая задача была дапамагчы Наталлі засвоіць адмысловую праграму для таксістаў, навучыць хутчэй арыентавацца ў горадзе. Яна схоплівала ўсё адразу і гэтым выклікала не проста цікаўнасць, а захапленне! Зрэшты,

> **«Хочацца хоць бы пару гадзін пабыць разам з мужам, зазірнуць у вочы, пагаварыць ці проста фільм паглядзець... Вельмі не хапае часу, каб проста быць разам».**

мне захацелася з ёй сябраваць, бо побач з гэтым чалавекам было ўтульна.

**Наталля:** Павел быў не проста настаўнікам, а паціху стаў праяўляць нейкі бацькоўскі клопат. Было відаць, што яму гэта вельмі падабаецца. І ён нічога лепшага не прыдумаў, як... паспрабаваць уладкаваць маё асабістае жыццё. Стаў нават сватаць сваіх сяброў, якія былі таксістамі (*смяецца*). Ён, вядома, пытаўся ў мяне дазволу перад тым, як даць мой нумар тэлефона каму-небудзь, а я пагаджалася, бо такім чынам разлічвала знайсці больш сяброў, якія дапамогуць у цяжкую хвіліну на дарозе. А Павел ніяк не мог здагадацца, чаму я не адказваю на іх заляцанні. Прыйшлося даць



зразумець майму настаўніку, што я не шукаю адносін, бо мне вельмі падабаўся ён сам.

**Павел:** Цяжка сказаць, як, але мужчыны адчуваюць сімпатыю дзяўчыны. Па ўсмешцы, вачах... Я адважыўся. Гэта ж было на заправцы, так?

**Наталля:** Так. Побач з запраўкай звычайна ёсць стаянка. Там вырашылі разам выпіць кавы, пабалбатаць... Памятаю, сядзелі ў Пашы ў аўто, калі да яго прыйшоў заказ і яму хутка трэба было ехаць. Ён пацягнуўся да мяне, каб пацалаваць... На шок і няёмкасць пасля пацалунка не было часу, бо Паўла дзесьці чакаў кліент, а я адразу выйшла з машыны.

**Павел:** Мы спачатку хавалі нашы адносіны, каб не бянтэжыць калег. Але потым не было сэнсу, усе разумелі, што нашы частыя сустрэчы — гэта ўжо не пра сяброўства.

### СЯМ'Я *VS* КАЛЕГІ

**Наталля:** Нягледзячы на тое, што мы ўвесь час на сувязі, мне не хапае стасункаў з мужам. Па сутнасці, мы сустракаемся ўжо амаль перад сном. Мозг разумее, што з раніцы трэба ўстаць крыху раней і паспець да гарадскога часу пік, таму вельмі трэба легчы спаць. Але з іншага боку, хочацца хоць бы пару гадзін пабыць разам з мужам, зазірнуць у вочы, пагаварыць ці проста фільм паглядзець... Вельмі не хапае часу, каб проста быць разам.

**Павел:** Але я ўжо прывык, што мая жонка працуе нароўні са мной. Таму і не даводзіцца чакаць цёплай хатняй вячэры. Мы разам увечары едзем у краму, выбіраем паўфабрыкаты ці тое, што можна вельмі хутка прыгатаваць і з'есці. Мы можам выехаць у 7-8 раніцы і вярнуцца дадому ў 10-11 вечара. Наталля часам можа з'ехаць крыху раней, калі ёсць неабходнасць дапамагчы дачцэ. Аднак мы абодва ведаем, што можам з'ехаць у любы час, каб пабыць побач.

> **«Мне здавалася, што ў сталіцы работы больш, і я хутка знайду сябе ў гэтым горадзе. Але Мінск не песціў мяне спачатку».**

**Наталля:** Так... Але выбар часцей за ўсё падае на рашэнне падзарабіць. І паколькі мы калегі, то разумеем адно аднаго. Гэта значыць, ад мяне Павел не чуе папроку ў тым, што ён затрымаўся на рабоце ці што ён выйшаў на работу ў выхадныя. Бо я ведаю, што ў гэтыя дні мы заробім больш. Таму часцей за руль садзімся абое. Так трэба, каб пражыць.

**Павел:** У мяне надзейны тыл. Калі чакаецца далёкая паездка, я не хвалююся, бо ведаю, што Наташа прыедзе да мяне. Памятаю, вёз кампанію за горад у катэдж. У машыне «запаскі» не было, бо багажнік спатрэбіўся для прадуктаў кліентаў. Ад'ехалі кіламетраў дзевяць ад горада, і раптам шына лопнула.

**Наталля:** Мне ж пару слоў дастаткова, каб зразумець праблему, з якой ён сутыкнуўся. Пакуль хлопцам, якія сядзелі ў машыне ў Паўла, выклікалі іншае таксі, я паехала ў месца, дзе ён пакінуў запаснае кола, і прывезла яго мужу за горад.

**Павел:** У Наталлі не лопаюцца колы, у яе заканчваецца бензін!

**Наталля:** І Павел ніколі мяне ў гэтым не папракнуў. Заўсёды прыедзе на дапамогу. Толькі пахіхікае.

### «БАБА» ЗА РУЛЁМ

**Наталля:** Звычайна да мяне пасажыры ставяцца вельмі добразычліва. Я акуратна ваджу аўтамабіль, і таму мной задаволены. Але ў таксі ёсць паслуга «цвярозы кіроўца», і вось там усякае бывае. Часам вельмі крыўднае. Не вельмі любяць мужчыны пускаць за руль свайго аўто жанчыну. Памятаю, у Раўбічах пад Новы год заказалі «цвярозага кіроўцу». Ніхто з нашых туды не хацеў ехаць: зіма, складаная дарога... А кліент проста маліў дыспетчара дапамагчы, гатовы быў чакаць 40 хвілін. Гэта вельмі доўга, бо звычайна кіроўца прыязджае на працягу 10 хвілін. У выніку я пагадзілася на сваю галаву. Прыязджаю, а там трое падпітых мужчын каля «джыпа» стаяць. Вясёлыя такія. Я выйшла са сваёй машыны, прадставілася, і тут кліент кажа: маўляў, не пушчу «бабу» за руль. Я так злавалася... Памятаю, строга, амаль з пагрозай сказала, што выбару ў іх няма, бо ехала да іх 30 кіламетраў і назад проста не паеду. Селі ўсё ж. Усю дарогу ехалі моўчкі. Я была вельмі акуратная, каб не раздражняць пасажыраў. У выніку давезла іх на месца. Заказчык потым усё ж папрасіў прабачэння і падзякаваў, ну і заплаціў добра.

**Павел:** Вядома, стаўленне рознае бывае, залежыць ад кліента. Але ўсё ж дзяўчат у нас любяць! Мне, напрыклад, ніхто дарагіх шчанюкоў не дарыў.

**Наталля** (*смяецца*): Так, і сапраўды. Памятаю, падвозіла кліента, а ён у руках мопсіка трымаў. Такога прыгожага — проста цуд! Зрэшты, кліент, бачачы маё непрыхаванае захапленне, даў патрымаць яго. Мопсік сядзеў у мяне ўсю дарогу на каленях, такі міленькі, такі ціхенькі, як зайчык. І ўсё спрабаваў лізнуць. Клічка шчанюка была Боцман. І калі прыйшоў час вяртаць, я вельмі расстроілася, кажу: можа, аддадзіце мне сабаку? Кліент пасмяяўся, вядома, але ў выніку даў грошы на тое, каб я набыла сабе шчанюка. Што я і зрабіла. Цяпер у нас жыве цудоўны французскі бульдог Бруна.

### ПАД БОЙ КУРАНТАЎ

**Павел:** Звычайна на Новы год мы працуем. Але бой курантаў слухаем разам са сваімі дзецьмі. Аднак мне больш падабаюцца Каляды. Я палюбіў гэтае свята, калі паехаў да Наталлі ва Украіну. Раства мы святкавалі ў хроснага жонкі. Там адчувалася столькі любові, цяпла і гасціннасці. Быў цудоўны калядны абед: перапёлкі, смачнае віно. За сталом весела жартавалі, расказвалі добрыя сямейныя гісторыі... У мяне засталіся з таго дня вельмі прыемныя ўспаміны, якія грэюць да гэтага часу. Думаю, справа была ў атмасферы любові, якая панавала ў тым доме.

**Наталля:** Так. Справа была ў людзях. Насамрэч не важна, дзе адзначаць свята, важна, каб побач былі блізкія, якіх ты любіш.

**Павел:** Новы год — таксама добрае свята, але звычайна мы працуем.

**Наталля:** Мы ж дамовіліся, што гэты Новы год адсвяткуем, як усе?

**Павел:** Так, сапраўды! Але хто ж будзе вазіць па горадзе Дзядоў Марозаў ці мужчын у касцюме Снягуркі?

**Наталля.** Ну, можа, на пару гадзін выедзем з раніцы 31 снежня... Дапаможам закупіцца мінчанам!

**Павел.** Так, пару гадзін папрацуем. Але максімум да трох дня! Вось ужо гэтая спакуса грашыма...

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ПАЛАСАТАЕ ШЧАСЦЕ

## Гаспадар прыватнага заапарка, народжаны ў год Тыгра, распавёў пра сваіх улюбёных гадаванцаў

**За 10 кіламетраў ад Мінска, у вёсцы Падгай, кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Вальготнае» год таму адкрыў кантактны заапарк. Кажа, з першага дня ведаў, што абавязкова абзавядзецца тыграмі. І ўжо вясной прывёз сабе двух васьмімесячных паласацікаў. З размовы высветлілася, што Юрый Карпіловіч нарадзіўся ў год Тыгра. І сваю «паласатую» мару выношваў даўно. Таму нават леапарда, які ў яго з'явіўся значна раней, назваў Тыгруля.**



Ваўкі абажаюць свайго гаспадара.

### «ХАЦЕЎ БЫ ПРЫРУЧЫЦЬ ТЫГРАЎ ЯК ВАЎКОЎ»

— Я так моцна марыў пра тыгра, што, калі 2,5 года таму завёў леапарда, не раздумваючы даў яму мянушку Тыгруля, — усміхаецца Юрый. — Дальнеўсходні леапард — вельмі рэдкая жывёла. 90 штук у свеце засталося. Тыгруля прыехаў да нас ужо дарослым, амаль трохгадовым. Спачатку быў неспакойны, кідаўся на клетку. Год мы з ім шукалі агульную мову. Цяпер жа, калі чуе мой голас, падыходзіць, становіцца на заднія лапы, як быццам просіць: «Пагладзь мне пуза». Бачыце, якая ў яго бліскучая шэрстка, жывоцік ужо стаў як у «таты», правісаць (*смяецца*).

І нядзіўна: кормяць Тыгрулю ялавічынай, натуральнымі курынымі яйкамі ды казіным малаком.

— Дасябраваліся да таго, — працягвае мой суразмоўца, — што я асмялеў, сам заношу леапарду ежу ў вальер. Пры гэтым абавязкова гляджу яму ў вочы. І выходжу спінай наперад, каб бачыць рэакцыю драпежніка.

Калі ў клетку да Тыгрулі Юрый Карпіловіч заходзіць з асцярожнасцю, то да ваўкоў — бачыла на свае вочы — спакойна. Быццам гэта не ваўкі, а звычайныя сабакі. Багірка і Воўка абажаюць свайго гаспадара.

— Калі заходжу да іх у вальер, могуць залізаць да смерці (*смяецца*). Яны адданыя, больш чым сабака. Без боязі гладжу іх, абдымаю. Гэтак жа, зірні (*паказвае фотаздымкі*), дрэсіроўшчык Міхаіл Зарэцкі з Падмаскоўя абдымаецца са сваімі тыграмі. Я пра такое пакуль толькі мару. Хацеў бы прыручыць тыграў як ваўкоў.

### «ВЫРАТАВАЎ АМУРКУ І ЦІМУРКУ АД ЦЫРКАВОЙ БУДУЧЫНІ»

Фермер шукаў паласацікаў па ўсім свеце. Потым знаёмыя падказалі, што ў цырку-шапіто, які гастралірue па Каўказе, чатыры месяцы таму нарадзіліся тыгранты. У той момант яны знаходзіліся ў Чачні. Чатыры месяцы дабіваўся дазволу на ўвоз і нарэшце вясной прывёз двух тыгранят. Можна сказаць, выратаваў малых ад лёсу быць цыркавымі жывёламі.

Ездзіў па сваю мару на мікрааўтобусе разам з жонкай Святланай. Амаль тры тысячы кіламетраў туды, столькі ж назад. У Мінскім заапарку ўзяў у арэнду клеткі для перавозкі.

— Праз кожную тысячу кіламетраў спыняліся, набывалі ў краме курыцу ды малако і кармілі тыгранят. У цырку бедакі сядзелі ў маленечкіх клетках. Бачыце (*паказвае фотаздымкі*), якія худыя былі. Іх там практычна не кармілі — па курынай тушцы кожнаму ў дзень і крыху малака.

Зараз памужнелі, бо «вусаты нянь» для іх нічога не шкадуе. Кожнаму дае па сем кілаграмаў мяса ў суткі ды па літры малака.

— У малако ка́паю па кроплі рыбінага тлушчу, — удакладняе Юрый. — І раз на два тыдні даю паласацікам чырвоную рыбу. Ім трэба фосфар, таму куплю фарэль ці сёмгу. Жонка толькі рукамі разводзіць: «Самі так не ядзім, як твае тыгры» (*смяецца*).

Паколькі тыгры амурскія, дзяўчынку Юрый Карпіловіч назваў Амурка. А хлопчыка сугучна — Цімурка. На двух паласаціках фермер спыняцца не збіраецца. Адмыслова ўзяў самца і самку, каб у будучыні мець патомства.

Калі тыгранят прывезлі ў Падгай, яны былі дзікаватыя. Нейкі час не вельмі паміж сабой ладзілі. Самец паказваў, што ён тут галоўны, і не падпускаў дзяўчынку да мяса, рыкаў. Цяпер жа паглядзець на гэ-



Паглядзіце на гэтую мілую парачку — проста «любоў-маркоў».

тую мілую парачку — проста «любоў-маркоў».

Перад клеткай Амуркі і Цімуркі на вуліцы, заўважыла, стаіць крэсла.

— Калі было цёпла, сядзеў там і размаўляў з тыграмі, — кажа Юрый. — І ўнутры, перад іх дамком, я зрабіў сабе трэніровачную, там яшчэ адно крэсла стаіць. Штодзень сам карміў іх мясам. Дзесьці праз месяцаў пяць яны пачалі мяне прызнаваць. Я іх ужо нават праз рашотку гладзіў. Але потым моцна захварэў, два месяцы праляжаў у бальніцы. Калі вярнуўся, не паверыў сваім вачам, так яны выраслі за гэты час. Паклікаў: Амурка падышла, а Цімур — не. Сталі мяне забываць. Зараз зноў прывыкаем адно да аднаго.

За колькі купіў сваіх тыгранят, фермер не сказаў. Але ў Маскве, кажа, за маленькага паласаціка прасілі шэсць тысяч долараў. Браць дарослага накладна. Ды і прыручыць яго практычна нерэальна, давядзецца падладжвацца. Маленькіх жа тыгранят можна выхаваць пад сябе.

Паказаў Юрый і фотаздымак, на якім ён гладзіць вялізнага тыгра. Не так даўно мужчыну пашчасціла трапіць у славуты на ўвесь свет сафары-парк «Тайган».

— Там адных толькі дарослых тыграў штук 40, — кажа. — Калі яго заснавальнік Алег Зубкоў даведаўся, што я страшэнна захапляюся паласацікамі, запрасіў мяне ў вальеру да аднаго са сваіх гадаванцаў. Мне было хоць і страшна, але пайшоў следам. Як толькі Алег падышоў да тыгра, той лёг каля яго ног як котка. «Падыходзь, — кажа, — пагладзь, не бойся». Я асцярожненька так дакрануўся, а драпежнік ляжыць і ў вус не дзьме, зусім не звяртае ўвагі. Менавіта ў той момант Алег і зрабіў фотаздымак.

### «КАЛІ ПАЧУЎ, ЯК ДЗЕЦІ НА КАНЯ СКАЗАЛІ «КАРОВА», ЛЕДЗЬ ІНФАРКТ НЕ СХАПІЎ»

Юрый Карпіловіч любіць усіх жывёл. Але найбольш, акрамя тыграў і ваўкоў, — коней. Ужо шмат гадоў разводзіць іх для душы. Гады тры таму напаўняў свежай вадой паілкі для жывёл і ўбачыў каля загарадкі хлопчыка гадоў васьмі з мамай.

— Ён заўважыў мяне і сказаў: «Як жа шанцуе дзядзьку! Вунь колькі ў яго конікаў!» Эх, думаю, «дзіця асфальту». Калі ж аднойчы пачуў, як гарадскія дзеці на каня сказалі «карова», мяне ледзь інфаркт не схапіў. Вось тады і з'явілася думка адкрыць кантактны заапарк, каб дзеці знаёміліся з рознымі жывёламі.

На той час у мяне ўжо быў міні-заапарк для сябе і сяброў. Падумаў, пашыру яго, і няхай прыязджаюць людзі глядзець. І дзецям карысна, і прыбытак будзе. Год з хвосцікам прайшоў, прыбытку пакуль і блізка не бачу. Можа, і пачаў бы зарабляць, калі б спыніўся. Але я не з тых. Не супакоюся, пакуль не зраблю ўсё, што задумаў.

Цяпер у Юрыя Карпіловіча 38 відаў жывёл і птушак. Здавалася б, дастаткова. А ён ужо рыхтуе месца пад новыя вальеры. Каго прывязе, не прызнаецца. Кажа — сюрпрыз. Ведаючы любоў гаспадара да драпежных жывёл, думаю, гэта будуць ільвы. Але пажывём-пабачым.

Вядома, утрымліваць цэлы заапарк вельмі затратна. Корміць жывёл пакуль што фермерская гаспадарка Юрыя. «Цукровы кароль» вырошчвае буракі, пшаніцу і авёс. Лішкі зерня прадае Мінскаму заапарку. Акрамя таго, фермер сам забяспечвае сваіх гадаванцаў сенам.

Галоўная памочніца Юрыя — жонка Святлана, яна ж спецыяліст па кадрах і бухгалтар. «Чалавек, без падтрымкі якога весці бізнес мне было б нашмат цяжэй, — кажа ён.

Ахвотна дапамагаюць малодшыя дзеці. Дачка Лера, ёй 10 гадоў, даглядае шатлендскіх поні, а на выхадных катае на іх дзетак, якія прыйшлі на экскурсію. Дзяўчынка з лёгкасцю іх запрагае, ды і сама цудоўна трымаецца ў сядле.

— На сёння мы адзіная племянная гаспадарка ў краіне па развядзенні шатлендскіх поні, — адзначае фермер. — Яны вельмі ласкавыя. Гэта проста цацка для дзетак.

12-гадовы сын Юрыя Лёша кожныя выхадныя прадае квіткі. Два старэйшыя сыны спачатку таксама дапамагалі, але іх хапіла ненадоўга.

— Сказалі, гэта не той бізнес, якім бы яны хацелі займацца, — кажа Юрый Карпіловіч. — Яны ж бачаць, што я не ведаю, што такое выхадныя. Фанатаў, гатовых працаваць на зямлі, трэба берагчы, бо яны вымiраюць як маманты (*смяецца*).

У Падгаі, дарэчы, можна пакатацца не толькі на поні, але і на вярблюдах. Што і зрабіў Дзіма Білан. Расійскі спявак прыязджаў у заапарк са сваім беларускім сябрам. Частым госцем тут з'яўляецца і гумарыст Яўген Крыжаноўскі. А яшчэ на падвор'і Карпіловіча можна паабдымацца з самымі мілымі і прыязнымі жывёламі ў свеце — ламамі і альпакамі.

### «ДАБІЎСЯ, КАБ У ПРЫЛУКАХ З'ЯВІЛАСЯ ВУЛІЦА ГРАФА ЧАПСКАГА»

Назва аграсядзібы сям'і Карпіловічаў — «Графская спадчына» — невыпадковая. Усяго за кіламетр ад заапарка ў пасёлку Прылукі месціцца палац Чапскіх.

— На жаль, пакуль не ўсе ведаюць сваю гісторыю, — кажа Юрый Карпіловіч. — Адзінкі, калі чуюць пра графа Чапскага, згадваюць піва. Але граф Караль Ян Аляксандр Гутэн-Чапскі праславіўся не толькі тым, што заснаваў піваварны завод. Шмат добрага ён зрабіў для людзей на пасадзе мэра горада Мінска: запусціў конку (трамвай, які вазіла па рэльсах запрэжаная пара коней), дабудаваў Купалаўскі тэатр, адкрыў першыя тэлефонную і электрастанцыі, прытулак для бяздомных. Мой цёзка Юрый Чапскі быў кіраўніком дваранства Мінскай губерні і таксама шмат карыснага зрабіў, у прыватнасці, каб аблегчыць людзям працу ў вёсцы.

Юрый Карпіловіч паказаў сваю калекцыю рарытэтных сельскагаспадарчых прыстасаванняў. Фермер збірае іх па ўсёй краіне. Многае засталося з часоў графаў Чапскіх. У прыватнасці, прататып першага камбайна. Два кані цягнулі, а адмысловы механізм прыводзіў у рух касу. Ці хаця б сячкарня. Спачатку быў агрэгат расійскай вытворчасці. Жонка накладвала траву і падштурхоўвала. А насупраць муж круціў кола за ручку. Як мінімум у сям'і было дзве каровы, трое свіней. Паспрабуй нарэзаць столькі травы. Нават 10 хвілін пакруціш тое кола — спіна баліць. Юрый Чапскі падгледзеў і прывёз з Германіі іншы, больш прадуманы, агрэгат. Здавалася б, усё тое ж самае: жонка падштурхоўвае траву. Але на іншым канцы сячкарні ўжо два колы з ручкай. З аднаго боку стаіць тата, з другога — сын, у дзве рукі круцяць нашмат лягчэй.

Юрый Карпіловіч прызнаўся, што яму, як і графам, таксама хочацца пакінуць пасля сябе светлы след. За 20 гадоў, што фермер шчыруе на зямлі, ужо шмат добрага зрабіў. Падсыпаў дарогі ў вёсцы, бо было ні прайсці ні праехаць. Асабліва ўвосень і ўвесну, згадвае, людзі да аўтобуснага прыпынку ішлі ў гумовых ботах, трымаючыся за плот, а потым пераабуваліся. Зрабіў мост праз раку Пціч, якая працякае побач. Шмат грошай уклаў у вясковы водапровад. Дапамог бабулям адстаяць мясцовую царкву — на яе месцы багатыя людзі хацелі адкрыць забаўляльную ўстанову. Зараз жа дапамагае святару добраўпарадкоўваць храм. Зрабіў алтар, званы, выразаў крыж з дубу. Дарэчы, менавіта дзякуючы Юрыю Уладзіміравічу ў Прылуках з'явілася вуліца графа Чапскага. Фермер сказаў, што як толькі з'явіцца грошы, усталюе на ёй імянную мемарыяльную дошку.

Падчас зімовых свят, што вельмі сімвалічна, Юрый Карпіловіч надзявае касцюм Дзеда Мароза і пераўтвараецца ў чараўніка. Пакуль мы размаўлялі, патэлефанавала жанчына з Мінска. Хоча перад Новым годам прыехаць у Падгай з сям'ёй, прасіла, каб Дзед Мароз пакатаў іх на санях і павіншаваў дзяцей у лесе.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# Уладзімір РАДЗІВІЛАЎ: «ЗАДАЧА ДЗЕДА МАРОЗА — РАБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ ШЧАСЛІВЫМІ»

**Каларыт Новага года заключаецца не толькі ў непаўторнай атмасферы гэтага свята. А яшчэ — у яго гісторыі, традыцыях, смаках і, вядома, героях. Няма ні аднаго чалавека, які б не пісаў лісты Дзеду Марозу, не расказваў яму вершы і не агучваў бы самыя запаветныя мары і жаданні. Ён жа чараўнік, ён дапаможа. Як яму гэта ўдаецца — ніхто не ведае, не належыць чараўнікам раскрываць свае сакрэты. Але адзін Дзед Мароз зрабіў выключэнне. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, майстар пародый, спявак, артыст размоўнага жанру Уладзімір Радзівілаў падарыў навагодні цуд тысячам хлопчыкаў і дзяўчынак. Інакш галоўны Дзед Мароз краіны не можа. Уладзімір Генадзьевіч упусціў «Звязду» ў чароўны свет Дзеда Мароза.**



***— Бадай, ці не самы папулярны навагодні анекдот гучыць так: «У жыцці мужчыны ёсць тры стадыі: верыць у Дзеда Мароза, не верыць у Дзеда Мароза, і сам Дзед Мароз». Уладзімір Генадзьевіч, вы таксама перад тым, як стаць Дзедам Марозам не верылі і верылі ў яго?***

— Калі б я не верыў у Дзеда Мароза, я б ім ніколі не стаў. Як чалавек можа быць Дзедам Марозам, калі сам не верыць у гэтага прыгожага чараўніка з белай барадой і адмысловым посахам? Гэтага не можа быць. Таму я веру ў Дзеда Мароза, як і ў добрыя, і ў цёмныя сілы. Без гэта ніяк. У жыцці ёсць белая і чорныя палосы. Але як бы там ні было, заўсёды перамагае дабро.

***— А свой першы выхад на сцэну ў ролі Дзеда Мароза памятаеце?***

— Гэта было ў горадзе Узда, я толькі прыйшоў з арміі, працаваў на аўтабазе, у Доме культуры... Неяк так атрымалася, што не было каму сыграць Дзеда Мароза. Прапанавалі мне, зразумела, адмовіцца не мог. Да статусу галоўнага Дзеда Мароза я прайшоў вялікі шлях. Быў Карлсанам, катом Матроскіным, ваўком. Спачатку навагоднія спектаклі праходзілі ў Палацы спорту. Потым — у Канцэртнай зале «Мінск», крыху ў цырку. А калі пабудавалі Палац Рэспублікі, мы пераехалі сюды. Вось так амаль 27 гадоў кожную зіму я — Дзед Мароз.

***— Біяграфію свайго героя вывучалі?***

— Безумоўна. Я падымаў усю паднаготную Дзеда Мароза. Вывучаў, што гэта за роля, хто як яе выконваў у розныя часы. Насамрэч Дзед Мароз узнікае раней за святочныя навагоднія дні. Ёсць спецыяльны абрад, калі вясна, лета, восень аддаюць свае правы зіме, і Дзед Мароз афіцыйна ўступае ў свае абавязкі. Гэты дзень лічыцца днём нараджэння Дзеда Мароза і адзначаецца 18 лістапада. Мяне усе ў гэты дзень віншуюць.

Акрамя таго, я сачу за дзіцячымі трэндамі, вывучаю сучасныя цацкі. Неяк ноч не спаў, даследваў, якія ёсць лялькі Барбі. Бо раптам дзіця задасць пытанне, а Дзед Мароз не зможа на яго адказаць. Такога дапусціць нельга. Быць Дзедам Марозам — не значыць проста выйсці, павітацца і аддаць падарункі. Не. Да гэтай ролі трэба рыхтавацца, павінны быць дабрыня, любоў. А не так, што прыйшоў, адпрацаваў, атрымаў грошы і пайшоў.

***— За 27 гадоў, што вы галоўны Дзед Мароз краіны, вырасла не адно пакаленне вашых маленькіх гледачоў...***

— І гэта ж добра! Летась да мяне прыйшла маладая жанчына. Яна паказала фота, дзе маленькай сядзіць у мяне на каленях, і прывяла сваю дачку на прадстаўленне. І мне было вельмі прыемна, што за час маёй кар'еры Дзеда Мароза вырасла моладзь, якая прыводзіць на «ёлку» сваіх дзяцей. Для мяне гэта вельмі важна. Значыць, я недарэмна стаў Дзедам Марозам і дару дзецям і дарослым радасць і шчасце.

***— Зноў жа, калі вярнуцца да анекдотаў. Адзін з іх сцвярджае, што быць Дзедам Марозам вельмі зручна — працуеш адзін дзень праз 364. А калі ў галоўнага Дзеда Мароза пачынаецца гарачы навагодні сезон?***

— Сёлета выступленні ў мяне пачаліся 23 снежня. Але работа пачалася ў лістападзе — вывучэнне сцэнарыя, рэпетыцыі, падрыхтоўка. Касцюм трэба падрыхтаваць, хоць касцюмы ў нас ствараюцца на пяць гадоў, за імі пастаянна трэба сачыць. Дзед Мароз ідзе ў нагу з часам, касцюм павінен быць модным і зручным. Мастак па касцюмах распрацоўвае эскіз, а я кантралюю, каб ён было зручна. Аднойчы зрабілі касцюм на маланцы, а ў Дзеда Мароза барада. Яна трапляе туды, і ўсё, хоць спі ў гэтым касцюме. Трэба прадугледжваць шмат невялікіх, але важных момантаў.

***— Сёлета вы выступаеце ў блакітным касцюме. Але ж мы прывыклі бачыць Дзеда Мароза ў чырвоным.***



— Дзеду Марозу дазволена быць у чыровоным і ў блакітным колерах. Калі ўспомніць таго ж Санта-Клаўса, якога таксама прывыклі бачыць у чырвоным, то з самага пачатку было не так. У чырвонае футра яго апранулі для рэкламы. Ён насіў чорную вопратку, бо трапляў у дом праз комін. А ў нас Дзед Мароз уваходзіць праз дзверы і таму выглядаць павінен адпаведна.

***— Дзед Мароз — традыцыйны, усім знаёмы персанаж. Для вас як для акцёра кожны год Дзед Мароз розны?***

— Безумоўна. Можа здацца, што быць Дзедам Марозам — значыць проста хадзіць вакол ёлкі ды ўсё. Але гэта зусім не так. Роля Дзеда Мароза для артыста — вельмі ганаровая і адказная. І кожны год гэта розныя ролі. Я сам і спяваю, і танцую, і пераўвасабляюся, калі трэба. Рэжысёры робяць са мной што заўгодна. А я з задавальненнем прымаю новыя ідэі для спектакля. Таму што ў самае галоўнае свята — Новы Год — трэба падарыць дзецям і дарослым святочны настрой.

***— Звычайна Дзед Мароз з'яўляецца ў канцы казкі. Чаму так?***

— Так было даўно задумана, таму што ён галоўны персанаж, які ўсіх аб'ядноўвае. Два гады таму Дзеда Мароза сталі больш уводзіць у сцэнарый. Была казка пра юнацтва Дзеда Мароза, затым пра тое, як да яго прыходзяць госці. А сёлета я задзейнічаны ва ўсім спектаклі.

***— За стольki гадоў кар'еры Дзеда Мароза былі кур'ёзныя выпадкі?***

— Самы памятны з іх, калі за 10 хвілін да выхаду дзеці выпадкова разбілі мой чароўны посах. А як Дзед Мароз можа выйсці да людзей без посаха? Жонка Таццяна разам з грымёрамі літаральна за 10 хвілін з дапамогай гірляндаў і мішуры яго выратавалі. Чараўніцтва, не інакш.

***— Уладзімір Генадзьевіч, вы выступаеце на дабрачынных ёлках перад дзецьмі з дзіцячых дамоў, хворымі дзеткамі. Напэўна, яны просяць у Дзеда Мароза тое, чаго вы ніяк не можаце выканаць. Вам маральна цяжка працаваць на такіх «ёлках»?***

— Многія людзі просяць у Дзеда Мароза тое, чаго ніхто не можа выканаць. Гэта жыццё. У межах сваіх магчымасцяў і сваіх кампетэнцый я стараюся дапамагчы, як магу. У навагоднія дні ў нашай краіне праходзіць выдатная акцыя «Нашы дзеці». Гэта паказальнік клопату нашай дзяржавы аб дзецях. Усе дзеці ў краіне — нашы дзеці і яны павінны адчуваць, што іх любяць, цэняць і шануюць. Я ім гэта паказваю, калі прыходжу да іх Дзед Мароз і дару навагодні цуд.

***— Для артыста дзеці — самая цяжкая публіка?***

— Дзеці — самая справядлівая публіка. Іх не падманеш, яны ўсё бачаць і адчуваюць. Я стараюся з дзецьмі размаўляць, як з дарослымі людзьмі. Яны ўсё разумеюць, бачаць усе падвохі. У іх вельмі сонечная аўра. Іх нельга падманваць.

***— Вы маеце зносіны са сваімі замежнымі калегамі, галоўнымі Дзядамі Марозамі іншых краін?***

— Некалькі гадоў таму было мерапрыемства ў Белавежскай Пушчы. Туды прыехалі галоўныя Дзяды Марозы — з Расіі з Вялікага Усцюга, з Казахстана, Татарстана... Амаль з кожнай постсавецкай краіны быў галоўны Дзед Мароз. Вядома, мы падтрымліваем зносіны. Агульную справу робім — кожны ў сваёй краіне дорыць людзям шчасце і радасць.

***— Дарэчы, пра Белавежскую Пушчу. Вы — галоўны Дзед Мароз краіны. А хто тады жыве ў Белавежскай Пушчы?***

— Таксама галоўны Дзед Мароз. У пушчы знаходзіцца рэзідэнцыя Дзеда Мароза. Там ён прымае гасцей круглы год. А выступленні на «ёлках», віншаванні — гэта мая місія. Роля ў нас адна — галоўны Дзед Мароз краіны. Толькі ён у Белавежскай Пушчы, а я — у Мінску. Дзядоў Марозаў, на шчасце, шмат. А місія ў нас агульная — вiншаваць людзей, дарыць ім шчасце і пазітыў.

***— Уладзімір Генадзьевіч, а хто галоўная Снягурка краіны?***

— У мяне кожны год розныя Снягуркі. Шмат таленавітых дзяўчат са мной выступала. Тут у чым справа? Снягурка павінна быць маленькай унучкай. А за год дзяўчынка можа вырасці, і мы ўжо не будзем выглядаць як дзед і маленькая ўнучка.

***— У жыцці галоўнага Дзеда Мароза краіны быў навагодні цуд?***

— Для мяне навагодні цуд — гэта выезд на дачу пасля навагодніх свят. Мы прыязджаем на любімую дачу, запальваем камін, прыязджаюць нашы блізкія людзі. Мы адпачываем, абменьваемся падарункамі, адзначаем Новы год, Раство. І гэта цуд з цудаў — бачыць сваіх блізкіх шчаслівымі і здаровымі. Сам Новы год мы сустракаем не вельмі святочна, 31 снежня і 1 студзеня ў мяне спектаклі. Таму я слухаю віншаванне Прэзідэнта, выпіваю келіх шампанскага і іду адпачываць. Але раз на год можна дазволіць сабе зрабіць дабро дзецям і дарослым і даць ім святочны настрой. Чым больш даеш людзям, тым больш сам адчуваеш гэтую аўру Дзеда Мароза, якая абдымае і зараджае пазітывам.

***— У вашай жонкі Таццяны Аляксандраўны 26 снежня дзень нараджэння, яго таксама адзначаеце пасля, на цудоўнай дачы?***

— Таццяна заўсёды са мной, таму ў яе дзень нараджэння святкуем у грымёрках, на рабоце. Можа, яно так і лепш, чым проста дома. Усе віншуюць, кажуць добрыя словы. І хоць графік насычаны, я не забываю рабіць ёй сюрпрызы. Сёлета, пакуль яна спала, паклаў на падушку вялікі букет хрызантэм. А сам паехаў на «ёлку».

***— Якое любімае свята ў галоўнага Дзеда Мароза краіны, акрамя Новага года?***

— Усе святы любімыя, гэта ж святы. Самая вялікае і любімае свята — калі ўсе здаровыя, гэта самае галоўнае. Дні нараджэння люблю, свой, жончын. Але з кожным днём нараджэння задумваешся аб пражытых гадах, пра тое, што не маладзею, але станаўлюся старэйшым, мудрэйшым.

***— Уладзімір Генадзьевіч, настае год Тыгра. Чаго вы чакаеце ад гэтага звера?***

— У нашым доме шануюць катоў. У нас быў кот Цімафей Маркізавіч, ён пражыў 25 гадоў. Ездзіў з намі на «Славянскі базар», у санаторыі. Для нас з жонкай кот — гэта член сям'і. Цяпер у нас жыве брытанская прыгажуня Рыжэна. Нядаўна пакрыўдзілася, што я з ёй не гуляю, падрапала твар перад ёлкай. Але мы яе вельмі любім. Яна падобная на тыгра, рыжая, паласатая. Таму, спадзяюся, у год Тыгра прынясе нам удачу.

***— Дзеду Марозу ўсе агучваюць свае жаданні. А каму іх расказвае сам Дзед Мароз?***

— Задача Дзеда Мароза — рабіць людзей шчаслівымі. А сам ён і так шчаслівы, бо ён чараўнік, чаго яму яшчэ жадаць?

***— Што галоўны Дзед Мароз краіны можа пажадаць усім у Новым годзе?***

*— Я жадаю вам радасці,*
*шчасця без межаў,*
*Запаветных спаўнення*
*надзей-таямніц...*
*Хай квітнее заўсёды краіна*
*цудоўная,*
*Хай ніколі не ступіць бяда*
*на парог.*
*Я жадаю вам новага года*
*чароўнага*
*І ў вашых пачатках — адных*
*перамог!*

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Грошы

# 2022 — ГОД ТЫГРА

**Нацыянальны банк выпусціў у абарачэнне памятную манету «Год Тыгра» серыі «Кітайскі каляндар»**

**Гэтая срэбная памятная манета наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 33,63 грама, дыяметрам 38,61 мм, накладам 1300 штук трапіла ў продаж у другой палове снежня.**



Манета мае форму круга, з пярэдняга і адваротнага баkoў — кант, які выступае па акружнасці. Бакавая паверхня манеты з насечкай.

Ва ўнутраным крузе аверса ў цэнтры — кампазіцыя, якая складаецца з элементаў гадзіннікавага механізма, Сонца і Месяца; у цэнтры гадзіннікавага механізма — устаўка з фіяніту; па крузе — лічбы, якія абазначаюць гады з 2013-га да 2024-га, па кольцасці гадоў аднаго цыкла кітайскага месячнага календара; золатам выдзелены асобныя элементы цэнтральнай кампазіцыі і «2022» (год Тыгра).

Рэверс: у цэнтры намаляваны тыгр, які скача праз вогненнае кола, па перыметры манеты — дэкаратыўныя элементы, знізу — выява пазалочанага кітайскага іерогліфа, які абазначае тыгра, уверсе — надпіс: ГОД ТЫГРА.

Манета адчаканена на прадпрыемстве «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага Банка Рэспублікі Казахстан» якасцю «пруф-лайк». Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам у нашай краіне і абавязковыя да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

Інфармацыя аб чаканых паступленнях, адпускных цэнах і наяўнасці памятных манет у касе Нацыянальнага банка, а таксама запланаваных датах продажу памятных манет размешчана на афіцыйным сайце Нацыянальнага банка ў раздзеле «Банкноты і манеты».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Извещение о проведении 31 января 2022 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ООО «АВРАСТОРГ»

| Предмет торгов № 1 |
|---|
| Седельный тягач Renault T 2016 5597-5 AC с инв. № 000000063, год выпуска 2016; полуприцеп специальный фургон-рефрижератор Krone SD, 2013 с инв. № 000000064, год выпуска 2013; седельный тягач Renault T 2016 5598-5 AC с инв. № 000000065, год выпуска 2016; полуприцеп специальный фургон-рефрижератор Krone SD, 2013 с инв. № 000000066, год выпуска 2013; седельный тягач Renault T 2015 5601-5 AC с инв. № 000000067, год выпуска 2015; полуприцеп специальный фургон-рефрижератор Krone SD, 2013 с инв. № 000000068, год выпуска 2013; седельный тягач Renault T 2015 5600-5 AC с инв. № 000000069, год выпуска 2015; полуприцеп специальный фургон-рефрижератор Krone SD, 2013 с инв. № 000000070, год выпуска 2013 |
| Местонахождение: Минский р-н, аг. Хатежино, ул. Центральная, 18Б/4-1 |
| Начальная цена: 272 906,66 евро |
| Сумма задатка: 500,00 бел. руб. |
| Шаг аукциона: 13 700,00 евро |
| **Предмет торгов № 2** |
| Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 600/D-105213 общей площадью 523,9 кв. м (наименование: изолированное помещение № 1; назначение: складское помещение); изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 600/D-105219 общей площадью 87,7 кв. м (наименование: изолированное помещение № 2; назначение: складское помещение); изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 600/D-106366 общей площадью 16,9 кв. м (наименование: изолированное помещение № 3; назначение: складское помещение) |
| Местонахождение: Минский р-н, аг. Хатежино, ул. Центральная, 18Б/4-1, 18Б/4-2, 18Б/4-3 |
| Начальная цена: 355 600,00 долларов США |
| Сумма задатка: 500,00 бел. руб. |
| Шаг аукциона: 17 800,00 долларов США |
| **Предмет торгов № 3** |
| Автомобиль легковой FORD FOCUS C346 2305-MT5 бело-черный (кузов Z6F5XXEEC5JM57056) с инв. № 000000054, год выпуска 2018; автомобиль легковой FORD FOCUS C346 2306-MT5 бело-черный (кузов Z6F5XXEEC5JM57606) с инв. № 000000055, год выпуска 2018; автомобиль легковой FORD FOCUS C346 2308-MT5 бело-черный (кузов Z6F5XXEEC5JM58260) с инв. № 000000056, год выпуска 2018; автомобиль легковой FORD FOCUS C346 2309-MT5 бело-черный (кузов Z6F5XXEEC5JM58521) с инв. № 000000057, год выпуска 2018; автомобиль легковой FORD FOCUS C346 2307-MT5 красно-черный (кузов Z6F5XXEEC5JM57608) с инв. № 000000058, год выпуска 2018 |
| Местонахождение: Минский р-н, аг. Хатежино, ул. Центральная, 18Б/4-1 |
| Начальная цена: 39 288,42 евро |
| Сумма задатка: 500,00 бел. руб. |
| Шаг аукциона: 2 000,00 евро |

**Продавец имущества:** общество с ограниченной ответственностью «АВРАСТОРГ», 223039, Минский р-н, аг. Хатежино, ул. Центральная, д. 18Б/10, пом 10/3.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в белорусских рублях в размере, эквивалентном 1 проценту от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток (задатки) по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному частнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества, подлежащая оплате в белорусских рублях, определяется в размере, эквивалентном цене продаже, указанной в протоколе о результатах торгов (о продаже предмета торгов единственному участнику аукциона), по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств в соответствии с условиями договора купли купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **31 января 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 03.01.2022 по 26.01.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45)** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 107-49-01.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(029) 107-49-01 (ООО «АВРАСТОРГ»).**

## ОАО «КЛИМОВИЧСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»

**информирует о том, что 17.01.2022 года состоятся вторые повторные электронные торги по продаже имущества (здания, сооружения, оборудования и транспорт) расположенного по адресу:**

- Могилевская область, г. Климовичи, ул. Набережная, 10;
- Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Волкова, 10;
- Могилевская область, Быховский район, аг. Грудиновка, ул. Тихая, д. 7;
- Могилевская область, Кричевский район аг. Красная Буда, ул. Заводская, 11;
- Могилевская область, Костюковичский район, д. Пасека;
- Могилевская область, Хотимский район, аг. Забелышин;
- Могилевская область, г. Костюковичи, ул. Заводская, 1.

**А также состоятся первые повторные электронные торги по продаже имущества:**

- автомобиль «ГАЗ-3102» год выпуска – 1996, регистрационный знак 5147 ТХ;
- автомобиль «ГАЗ-53» год выпуска – 1988, регистрационный знак ТВ1352;
- полуприцеп «ЛАМБЕРЕТ 32С» год выпуска – 1986, регистрационный знак 3332 ТВ.

С информацией об условиях проведения электронных торгов можно ознакомится на сайтах: **torgi.gov.by и bankrot.gov.by.**

УНП 700103211

### Уважаемые акционеры

## ОАО «Стройтрест № 35»

**12 января 2022 года в 14.30**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Стройтрест № 35»,**

**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, четвертый этаж, актовый зал**

**Повестка дня собрания**

1. О создании ООО «ЕвроСтройСтандарт» и об участии в нем ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 35»

С материалами к общему собранию акционеров Общества акционерам можно будет ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, в кабинете № 311 с 05.01.2022 по 11.01.2022 в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в день проведения собрания 12.01.2022 – с 09.00 до 14.15.

Регистрация будет проводиться 12.01.2022 с 13.00 до 14.15 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании по состоянию реестра на 06 января 2022 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100289278

Утерянное представительством Белгосстраха по Пуховичскому району страховое свидетельство обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь, серия МА № 3385306 в количестве 1 (одна) штука **считать недействительным.**

УНП 100122726

И З В Е Щ Е Н И Е   О   П Р О В Е Д Е Н И И   П О В Т О Р Н Ы Х   Т О Р Г О В

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»

## 12 января 2022 г. в 14.00

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ

| № п/п | Номенклатурный номер | Наименование объекта продажи | Начальная цена продажи снижена на 20 % и составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | 2518571 | **Вал-шестерня 4201.24.702.0.0 – 1 шт.** | 3552,00 (три тысячи пятьсот пятьдесят два рубля 00 копеек) | 355,20 (триста пятьдесят пять рублей 20 копеек) |
| Лот № 2 | 2518571 | **Вал-шестерня 4201.24.702.0.0 – 1 шт.** | 3552,00 (три тысячи пятьсот пятьдесят два рубля 00 копеек) | 355,20 (триста пятьдесят пять рублей 20 копеек) |
| Лот № 3 | 2502488 | **Сборка вала 4212.31.320.0 – 1 шт.** | 13 440,00 (тринадцать тысяч четыреста сорок рублей 00 копеек) | 1 344,00 (одна тысяча триста сорок четыре рублей 00 копеек) |
| Лот № 4 | 2511475 | **Вал-шестерня в сборе с колесом 4212.31.280.0 – 1 шт.** | 32 736,00 (тридцать две тысячи семьсот тридцать шесть рублей 00 копеек) | 3 273,60 (три тысячи двести семьдесят три рубля 60 копеек) |
| Лот № 5 | 2501807 | **Сборка вала. 4212.31.250.0 – 1 шт.** | 73 248,00 (девяносто одна тысяча пятьсот шестьдесят рублей 00 копеек) | 7 324,80 (семь тысяч триста двадцать четыре рубля 80 копеек) |
| Лот № 6 | 2518572 | **Сборка вала 4212.31.250.0 – 1 шт.** | 73 248,00 (девяносто одна тысяча пятьсот шестьдесят рублей 00 копеек) | 7 324,80 (семь тысяч триста двадцать четыре рубля 80 копеек) |
| Лот № 7 | 2506627 | **Крышка загрузочная ч. № 309.21.001.00 – 1 шт.** | 117 888,00 (сто семнадцать тысяч восемьсот восемьдесят восемь рублей 00 копеек) | 11 788,80 (одиннадцать тысяч семьсот восемьдесят восемь рублей 80 копеек) |
| Лот № 8 | 2506229 | **Крышка разгрузочная ч. № 309.24.001.0.0 – 1 шт.** | 116 448,00 (сто шестнадцать тысяч четыреста сорок восемь рублей 00 копеек) | 11 644,80 (одиннадцать тысяч шестьсот сорок четыре рубля 80 копеек) |
| Лот № 9 | инв. № 00445081 | **Экскаватор ЭКГ (карьерный) – 1 шт.** | 2 021 088,00 (два миллиона двадцать одна тысяча восемьдесят восемь рублей 00 копеек) | 202 108,80 (двести две тысячи сто восемь рублей 80 копеек) |
| Лот № 10 | 2403073 | **Сборка вала II ступени 4201.24.540.0 – 1 шт.** | 29 952,00 (двадцать девять тысяч девятьсот пятьдесят два рубля 00 копеек) | 2 995,20 (две тысячи девятьсот девяносто пять рублей 20 копеек) |
| Лот № 11 | 2403073 | **Сборка вала II ступени 4201.24.540.0 – 1 шт.** | 29 952,00 (двадцать девять тысяч девятьсот пятьдесят два рубля 00 копеек) | 2 995,20 (две тысячи девятьсот девяносто пять рублей 20 копеек) |
| Лот № 12 | 2502074 | **Сборка вала 4212.31.280.0 – 1 шт.** | 32 736,00 (тридцать две тысячи семьсот тридцать шесть рублей 00 копеек) | 3 273,00 (три тысячи двести семьдесят три рубля 00 копеек) |
| Лот № 13 | 2511476 | **Вал с колесом черт. 4212.31.210.0.0 – 1 шт.** | 89 568,00 (восемьдесят девять тысяч пятьсот шестьдесят восемь рублей 00 копеек) | 8 956,80 (восемь тысяч девятьсот пятьдесят шесть рублей 80 копеек) |

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудски с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: https://mogilev.cci.by

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1–13 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся в 12 января 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 11 января 2022 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 12 января 2022 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375 0296927492 (A1).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: https://mogilev.cci.by.

Извещение о предыдущих торгах по объекту было размещено в газете «Звязда» от 20.11.2021 г.

# «ЦАЦКІ»-ГІЛЬЗЫ І ПАДАРУНКІ РАДЗІМЕ

## Як святкавалі Новы год беларускія партызаны



**Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца сховішчам найбольш поўнага збору рукапісных партызанскіх часопісаў — 248 выданняў, прасякнутых гераізмам і самаахвярнасцю беларускіх партызан. Кожнае — у адзіным экзэмпляры! Унікальная калекцыя, якая ў 2009 годзе набыла статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, знаходзіцца на спецыяльным захоўванні.**

Гэтыя дакументы эпохі як зрэнку вока берaглі і ў гады вайны: разам са сцягам і дакументамі штаба, брыгады, атрада іх хавалі ў скрыні ад снарадаў і патронаў. Вялікую каштоўнасць рукапісныя часопісы, якія ствараліся самімі партызанамі, уяўляюць і сёння. Напісаныя ад рукі або надрукаваныя на машынцы сшыткі ці альбомы рознага фармату і аб'ёму раскрываюць раней невядомыя старонкі гісторыі партызанскай барацьбы, разбураюць некаторыя стэрэатыпы аб дзейнасці народных мсціўцаў. З іх можна даведацца не толькі аб дэталях падрыхтоўкі і ажыццяўлення баявых аперацый супраць ворага. Старонкі часопісаў дазваляюць акунуцца ў побыт партызан: з цікавасцю чытаеш, як яны адпачывалі, што елі, чым лячыліся, якім чынам пазбаўляліся ад паразітаў і нават як святкавалі Новы год.

### СТАВІЛІ ЁЛКУ І ЧАСТАВАЛІ ДЗЯЦЕЙ

Гэтае свята доўгі час не з'яўлялася ў краіне дзяржаўным. Аднак адзначалі яго ўсюды і заўсёды, нават у гады ваеннага ліхалецця. Вось як успамінаў лясны Новы год камандзір партызанскага атрада «За Радзіму» брыгады «Беларусь» Мінскай вобласці Пётр Ганчароў: «Наш атрад, у якім налічвалася да 400 партызан, быў створаны і дзейнічаў у раёне Рудзенска, гэта ўсяго 25 кіламетраў ад Мінска. Блізкасць праціўніка прымушала пастаянна думаць аб асцярожнасці. У лагеры ў абавязковым парадку ўпрыгожвалі ёлку, але не цукеркамі і арэхамі ў пазалочанай паперы. «Цацкі» на ёй былі ваенныя — прывязвалі за вяровачку стрэленыя гільзы, нават гранаты і міны. Акрамя таго, клеілі цацкі з дасланых з Вялікай зямлі часопісаў. Выкарыстоўвалі шышкі, якія засталіся на дрэвах з восені, атрымлівалася вельмі прыгожа. Пад Новы год кожная рота думала аб падарунку, які яна зробіць Радзіме — аб баявой аперацыі. Гэта былі спаленыя масты, падбітыя з супрацьтанкавай стрэльбы паравозы, забітыя немцы».

Пра ўсё гэта партызаны размаўлялі на навагоднім сходзе, які абавязкова праводзіўся. Як і ў іншае свята, на ім зачытваўся святочны загад-віншаванне, дзе партызанскае камандаванне аб'яўляла падзяку байцам, якія асабліва вызначыліся. Затым было сціплае застолле. Праўда, сабрацца ўсім разам не атрымлівалася: многія партызаны былі на баявых аперацыях.

«Я, як камандзір, даваў распараджэнне супрацоўнікам кухні прыгатаваць абед лепшы, чым звычайна, — успамінаў Пётр Ганчароў, які быў адным з першых супрацоўнікаў Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. — Атрад у навагоднюю ноч не спаў. Звычайна людзі збіраліся каля вогнішчаў, у зямлянках і ўспаміналі даваенае мірнае жыццё. Віншавалі мы і мясцовае насельніцтва. Аднойчы мы з начальнікам штаба, апрануўшы маскіровачныя халаты, якія павінны былі адлюстроўваць касцюмы Дзеда Мароза і Снягуркі, прывозілі ў вёскі сані з хлебам і праснакамі для дзяцей».

У атрадзе «За Родину» быў свой ансамбль песні, які складаўся з сямі чалавек. Гармонік, скрыпка, бубен, барабан і дзве гітары ўпрыгожвалі партызанскія будні. У святочныя дні партызаны ўвогуле ладзілі ледзь не канцэрты. Прычым не толькі для сябе, але і для жыхароў навакольных вёсак. Безумоўна, гэта ўзнімала настрой і ўсяляла веру ў хуткую Перамогу.




У навагоднім выпуску часопіса «Патриот Родины» П. Ганчароў падрабязна распавядае аб баявой дзейнасці свайго атрада напярэдадні свята.

### «З НОВЫМ ГОДАМ, З НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ!»

З надзеяй на хуткую Перамогу сустракалі партызаны і новы 1944 год. Аб гэтым сведчаць не толькі рукапісныя часопісы, але і дзясяткі баявых ліcткоў і сценгазет. У святочным баявым лістку пад нумарам адзін у 1944 годзе партызаны атрада «Мститель» брыгады «Народные мстители» Мінскай вобласці адзначаюць, што 1 студзеня 1944 года спаўняецца 25 гадоў з дня арганізацыі БССР. «25-я гадавіна БССР адбываецца ва ўмовах Айчыннай вайны, — пішуць аўтары. — Савецкі народ і Чырвоная Армія змагаюцца за разгром і выгнанне гітлераўцаў з нашай зямлі. Беларускія партызаны разбураюць тылы ворага, наносяць моцныя ўдары па яго камунікацыях, дапамагаюць Чырвонай Арміі граміць праклятых нямецкіх бандытаў. Блізіцца дзень канчатковага разгрому фашысцкай сволачы. Блізіцца доўгачаканы дзень адплаты немцам за кроў, за раны, за здзекі над беларускім народам».



У гэтым выпуску таксама расказваецца аб паспяховых баявых аперацыях атрада, пра дапамогу, якую партызанам аказваюць мірныя жыхары, пра падрыхтоўку да зімовых умоў вайны. «Усе партызаны роты забяспечаны кажухамі і рукавіцамі, — паведамляюць народныя мсціўцы. — Большасць партызан маюць добры абутак і цёплыя шапкі. Выраблены 42 маскіровачныя халаты. Усе партызаны забяспечаны «НЗ» і сумкамі для яго захоўвання».

А яшчэ сярод партызан было шмат таленавітых людзей: яны выдатна малявалі, складалі вершы, песні, прыдумлялі гумарыстычныя гісторыі. У навагоднім нумары часопіса «Народный мститель» Мінаўчыны, органа партыйна-камсамольскай арганізацыі і камандавання партызанскай брыгады імя Калініна, не абышлося без вершаў:

*Наш Дед-Мороз, наш славный Дед,*
*Принёс нам чудеса побед.*
*Но внук, не уступая Деду,*
*Несёт нам полную Победу!*

### ДАКУМЕНТЫ ЭПОХІ

На працягу многіх дзесяцігоддзяў за калекцыю рукапісных партызанскіх часопісаў адказвае **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Наталля ФІЛІПОВІЧ.** Найстарэйшы супрацоўнік музея не толькі расказа, як правільна захоўваць гэтыя артэфакты, яна добра ведае і тое, пра што напісана ў кожным нумары, у якіх умовах яны ствараліся. У свой час Наталля Іосіфаўна нават была знаёмая з аўтарамі некаторых публікацый, з людзьмі, дзякуючы якім многія з рукапісных часопісаў захаваліся.

Сярод іх — муж і жонка Дзідзенкі, якія былі партызанамі атрада імя Кутузава 2-й Мінскай брыгады. Да вайны Рыгор працаваў артыстам размоўнага жанру: чытаў на сцэне фельетоны, маналогі, спяваў прыпеўкі, якія сачыняў сам. Невыпадкова гэты таленавіты чалавек стаў рэдактарам рукапіснага часопіса «Кутузовец». Сёння ў музейных фондах захоўваецца дзевяць нумароў выдання, якія існуюць толькі дзякуючы гэтай сям'і. Падчас жорсткіх баёў Зінаіда і Рыгор Дзідзенкі загарнулі дзевяць выпускаў у трывалую мешкавіну і закапалі іх на ўзлеску. Пасля зняцця блакады і злучэння партызан з рэгулярнымі войскамі часопісы дасталі з надзейнага сховішча і аддалі ў Беларускі штаб партызанскага руху. Затым рэліквіі перадалі ў музей.

— Кожны часопіс — гэта жыццё, барацьба, творчасць партызан Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — заўважае Наталля Філіповіч. — Гэта своеасаблівая справаздача аб баявой дзейнасці, дакумент гісторыі аб той партызанскай вайне, аб чалавеку на ёй. Аб партызанскім руху шмат небыліц, аднак перад намі — сапраўдныя дакументы, рэліквіі, якія адлюстроўваюць тое, што было на самай справе. Рукапісным часопісам няма цаны, і з гадамі яны набываюць большую каштоўнасць.

Яны яшчэ ўнікальныя тым, што былі рукапісныя, ствараліся на сшытках, шпалерах, абгортачнай паперы і нават на бланках фашысцкіх дакументаў. У рэдакцыі набіралі пісьменных людзей, якія мелі прыгожы зразумелы почырк. Многія — з вышэйшай адукацыяй, некаторыя валодалі навыкамі журналісцкай работы.

— Партызаны пісалі аб тым, што падказвала душа, — удакладняе Наталля Іосіфаўна. — Адзін пісаў, як ён збег з палону, другі расказваў гісторыю свайго шляху ў партызанскі атрад, трэці распавядаў, як загінуў яго баявы таварыш... Былі адзначаны тыя, хто вызначыўся ў баях. Аднак выкрываліся і ўсе негатыўныя моманты партызанскага побыту: барацьба з марадзёрствам, пакаранне партызан за правіннасць. Усё, што ёсць у нашым жыцці, было і там. Гэтыя часопісы прызначаліся для ўнутранага карыстання. Невыпадкова захоўвалі іх беражліва, перадавалі з роты ў роту, з атрада ў атрад. Была чарга з ахвотных пачытаць часопісы. Так іх любілі партызаны.

Красамоўны факт — дзякуючы рукапісным часопісам многія народныя мсціўцы пасля вайны змаглі даказаць сваю прыналежнасць да партызанскага руху. Дзясяткі, сотні прозвішчаў, апублікаваныя на пажаўцелых ад часу старонках, сталі сур'ёзным аргументам і дакументам у справе рэабілітацыі імёнаў тых, хто таксама набліжаў Перамогу.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

# КУЛІГІ, ФАНТЫ, СНЕЖНЫЯ БАЛВАНЫ

## Як бавілі ўзімку час літаратурныя героі



**Спаконвек людзі прыдумвалі, як заняць сябе доўгімі зімовымі вечарамі. Мабыць, нездарма на гэты час прыпадалі самыя вясёлыя святы, а ў вёсках наставала пара вяселляў — каб на санях, ды са званочкамі-шаргунцамі на конях... Зразумела, у герояў беларускай літаратуры таксама хапала чым сябе заняць — згодна з фантазіяй аўтараў. Нешта вартае пераймання, нешта — смеху ці суму.**
**Давайце ж паглядзім на іх зімовае баўленне часу.**

### 1. Аб'есці шляхетнага суседа падчас карнавалу

Вялікі знаўца старажытных беларускіх святочных традыцый — Адам Мальдзіс, абавязкова прачытайце яго кнігу «Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі», напісаную на матэрыяле мемуараў і хронік тае эпохі. Мальдзіс распавядае пра культ госця, які панаваў у нашых продкаў. Праўда, некаторыя падарожнікі злоўжывалі звычаямі, і гэта пра іх склалі прымаўку накшталт «Госць і рыба на трэці дзень смярдзяць».

«Асабліва нахабна паводзілі сябе госці ў час «карнавалу» — ад Каляд да Вялікага посту. Перад запустамі (Масленіцай) шляхта наладжвала так званыя кулігі. Іх удзельнікі рабілі вялікія спусташэнні, якія апісаны ў мемуарах Кітовіча. «Ніжэйшай заможнасці шляхта праводзіла кулігі. Яны выглядалі прыкладна так: два або тры суседы дамаўляліся паміж сабой, бралі з сабой жонак, дачок, сыноў, слуг — усіх дарослых, што былі ў доме, пакідалі ў ім толькі малых дзяцей пад наглядам якіх двух чалавек, мужчыны і жанчыны. Самі ж, напакаваўшыся ў санкі, калі ж саннай дарогі не было — у каляскі, карэты, вазочкі, а таксама на ездавых коней, як хто мог, кіраваліся да бліжэйшага суседа, які ані прасіў іх, ані папярэджваўся (бо мог скрыцца ці з'ехаць з хаты). Там, заставўшы яго знячэўку, загадвалі даваць ім есці, піць, коням і людзям, без ніякай цырымоніі — як салдаты ў час збору падаткаў. Да таго часу ў яго дэбашырылі, пакуль не апаражнілі ў яго склеп, камору, свіран. Калі ж ужо выелі і выпілі ўсё, што было, бралі таго небараку з сабой з цэлай яго сям'ёй і цягнуліся да іншага суседа, якому рабілі такое ж спусташэнне, затым ехалі далей, пакуль не даходзіла чарга да тых, хто пачаў куліг».

### 2. Зляпіць снежнага балвана і паваражыць

Карыстаўся даследаваннямі Адама Мальдзіса і яго сябар Уладзімір Караткевіч. Вось ужо хто ўмеў маляўніча апісваць старадаўнія святы! У рамане «Каласы пад сярпом тваім» маладыя шляхцюкі і на санях катаюцца, і ў прастанародную «Жаніцьбу Цярэшкі» гуляюць, і феерверкі ладзяць... Займаюцца таксама вось чым:

«Насупраць ганка стаяў вылеплены Мсціславам снегавы балван. Ён быў вышэйшы за чалавека, і ў яго была самая смешная з усіх балваноў на зямлі пыхатая пыса.

Мсціслаў вылепіў балвану і грудзі, але прыйшоў гер Фельдбаўх, няўхвальна паглядзеў на гэтую вольнасць, паківаў галавою і ўласнаручна адрэдагаваў балвана.

Снег. Яліны. Снежны балван. Агеньчыкі ў вокнах. Гэта нагадвала б калядную карцінку, каб не існавала ў натуры».

На Каляды, вядома, і варажылі... Юная Майка Раўбіч, якую палохае пачуццё да Алеся Загорскага, хоча ведаць, што яе чакае.

«Ліўся, застываў у вадзе перакручаны, паравіты воск. Нібы ў місе ўставалі гарады і дзівосныя звяры.

А ў люстэрку, між двух агнёў, яна бачыла бясконца паўтораныя, нібы ў доўгім, загнутым налева калідоры, сваё бледнае абліччa і ўзбуджаныя трывожныя вочы.

— Толькі ён такі, той, аб кім думаеш, — шаптала Тэкля. — Толькі з ім. Не адмаўляйся, усё адно не атрымаецца. А век до-оўгі..»

### 3. Рабіць цацкі з бульбін і спяваць

Сяргей Грахоўскі ў аўтабіяграфічным творы «Зімовыя сны» ўспамінае дзяцінства, калі яны з маці жылі па чужых кутах, а маці шаравала падлогі ў панскіх пакоях, мыла і прасавала бялізну.

«Зімою па разутасці я сядзеў дома і гартаў той адзіны часопіс, з бульбін і трэсачак рабіў «пільшчыкаў», рагатых кароў і расстаўляў на лаве цэлыя чароды. З бульбін зрабіў і пастуха, праўда, на чатырох нагах, бо на двух не стаяў».

Былі і іншыя радасці: «Седзячы на зэдліку, мама абірала картоплю, а я на падлозе расстаўляў бязрукіх і аднаногіх аблезлых і пагнутых алавяных салдацікаў. Мама паціху спявала: «Степь да степь кругом, путь далёк лежит...», і я далучаўся тоненькім галаском: «А в степи глухой памирал ямщик». Хто такі ямшчык, я не ведаў і не пытаўся ў мамы, — быў упэўнены, што чалавек, які капае ямы».

### 4. Пагуляць у фанты і адправіцца на паляванне

Вялікі знаўца народных зімовых забаў — Якуб Колас. У паэме «Новая зямля» ён сакавіта апісаў сваё дзяцінства ў лясніковай сядзібе. Чытачы на памяць вучаць, як герой Костусь коўзаецца на лёдзе ракі, а бацька сямейства Міхал ідзе на паляванне... А вось у рамане «На ростанях» зіма іншая... Малады настаўнік Лабановіч, а менавіта выраслы Костусь, пачынае кар'еру вясковага настаўніка... На жаль, сярод правінцыйнай інтэлігенцыі няма аднадумцаў, пануе мяшчанства і абыякавасць да беларускай культуры. Лабановіча змушаюць завітаць у госці да пісара, дзе бавяць час тутэйшыя «падпанкі».

«Пісарава гасціная ярка асвятлялася дзвюма лямпамі. Пераступіўшы парог і акінуўшы поглядам гасцей, Лабановіч прыпыніўся ў нейкім замяшанні: да каго наўперад падысці і з кім павітацца, проста не ведаў хлопец, куды дзецца — так многа было тут гасцей. Трэба б было пачаць з гаспадара, але гаспадар сядзеў за сталікам, трымаў цэлую жменю карт і пільна ў іх углядаўся. Насупраць блішчаў урадніцкі каўнер. Збоку сядзеў фельчар Гарошка.

Ён падганяў пісара:

— Хадзі, хадзі, кум! Пад туза! Пад туза яму!»

Але карты і заляцанне да мясцовай прыгажуні Людмілы — не ўсе забавы...

«Вечар скончыўся гульнямі. Селі гуляць у «фанты». Было дамоўлена, што той, хто праштрафіцца, павінен па свайму выбару пацалаваць каго-небудзь з прысутных. Калі праштрафіцца хлопец, ён павінен выбраць дзяўчыну, і наадварот. Самым цікавым у гульні і быў гэты момант. Аматараў праштрафіцца знайшлося нямала. Праштрафілася і дваранка. З хітраватаю ўсмешкаю выйшла яна ў круг. Крадучыся, як кошка, яна абвяла поглядам хлопцаў і падышла да Лабановіча. Бедны настаўнік збянтэжыўся, чым і выклікаў дружны смех і воплескі».

І які ж хлопец шчаслівы, калі нарэшце выбіраецца з гэтага «духоўнага» асяродку...

### 5. Папрасці, паспяваць і не ўкрасці елачку

Кандрат Крапіва пісаў не толькі байкі. У ягоным ранні апавяданні «Снег ідзе» малады камсамолец Якуб сутыкаецца з цяжкай дылемай: бацька намаўляе ісці ў лес і забраць сухую елку. А гэта ж крадзеж у народа! І бацькі-працаўніка шкада, і сумленне камсамольскае вярэдзіць... Таму Якуб ідзе на вячоркі, дзе дзяўчаты па традыцыі бавяць час за прадзеннем.

«А ў Змітравых зырка гарыць на камінку смаліна і пужае час ад часу дзяўчат, страляючы ім на прыпол. «Гасцінец будзе», — цешаць яны адна другую...

Самі скачуць на панажах правыя ногі дзяўчат, зліваюцца ў адзін круг спіцы, жвава смычуць мокрыя пальцы сівую льняную бараду. Вілачак зусім не відаць: яны ў шалёным захапленні круцяцца наўкол свайго шпяня, ледзь спраўляючыся накручваць на шпулю мокрую нітку.

Даўно пераказалі дзяўчаты ўсе вясковыя навіны, перапелі шмат песень і цяпер трохі прыціхлі. Адна з іх, што бліжэй да камінка на зэдліку, раз-пораз паглядае цераз плячо на дзверы. Яе сіняя крамная сукенка і русыя, чуць кучаравыя валасы ёй надта да твару. Левая шчака нагрэлася ад камінка — румяная і пульхная. Гэта той магнэс, які цягнуў Якуба да Змітравых».

Пасля спаткання з каханай Якуба чакае яшчэ адна прыемнасць: яму ўдаецца адгаварыць бацьку ад таго, каб красці елку!

### 6. Накарміць калядоўшчыкаў рэпай

У цудоўнай казачнай аповесці Пятра Васючэнкі пра прыгоды паноў Кубліцкага ды Заблоцкага, стылізаванай пад старажытныя беларускія мемуары і хронікі, галоўныя героі, лянотныя паны, сустракаюць зімовыя святы сумнавата... Бо няма ў іх нічога да стала, акрамя рэпы.

«У калядную ноч запальваюцца ў небе зоркі, бы тысячы сярэбраных свечак. Паны пакрываюць стол накрухмаленым ільняным абрусам, кладуць пад яго, як і мае быць, сена — каб наступны год пражыць у шчасці ды дастатку. Ставяць на стол сем посных страў: рэпу печаную, рэпу смажаную, рэпу пражаную, салату з рэпы, рэпныя грыбы, рэпны гарэх; а ў галаве стала, у гліняным гаршку, нібы каравела якая, стаіць куцця з рэпы.

Пан Заблоцкі расчыняе акно, стукае ў падваконне драўлянаю лыжкаю і кажа, як належыць па звычаю:

— Мароз, мароз, ідзі куццю есці!

— Зараз іду! — адгукаецца з цемры хтось».

Адказвае не хто-небудзь, а калядоўшчыкі. А чым іх сустракаць?

«— Ты што, пане, блёкату аб'еўся? — надта ветліва і далікатна адказвае пан Заблоцкі. — Не адкрыць калядоўнікам?! То ж смяротны грэх! Няхай рэпу апошнюю забіраюць, але я ім адчыню.

І ён кідаецца да дзвярэй ды рашчыняе іх наўсцеж. Імгненна ў хаціну ўвальваюцца калядоўнікі — разам з марозною параю, ды снегам, адсталым ад валёнак, вясёлым скавытаннем ды кугіканнем. У панскай хаце робіцца цесна ад зыкаў ды спеваў».

Але не трэба аддаваць апошнюю рэпу: паноў чакае сапраўдны калядны цуд: гэта прыйшлі да іх сябры і прынеслі пачастункі. У адным кашы — кілбасы, булкі, цукеркі, марцыпаны, біклажкі з віном... «Вось другі кош, поўны фінікаў, хвігаў, мігдалаў ды іншых заморскіх пладоў, што ў Палястыне растуць. Вось куфар, на куфры надпіс: "Дзякуй за добрыя адносіны да жывёлаў". Адчыняюць, а ў ім — свінка, з лычыкам і крыльцамі, з чыстае чакаляды, ды важкая такая!

Вось торбачка, у ёй нешта прыемна так, меладычна дзвэнгае. Развязалі торбачку — а з яе глядзяць на паноў масляна-жоўтымі вочкамі залатыя дукаты, дукаты, дукаты... Вось дзежачка з мёдам, ладненькая такая... Вось мех з аўсом. Вось бочачка з селядцамі.

Ад такое раскошы паны проста розум губляюць. Пан Кубліцкі кажа: «Мама», пан Заблоцкі кажа: «Бабуля». І абодва пакаціліся на падлогу, як два снапы.

Ужо на іх пырскалі, хукалі, кілбасу пад нос падносілі. Нарэшце паны ачомаліся.

...Ну ж і Каляды ўдаліся ў паноў Кубліцкага ды Заблоцкага! Частаваліся хто чым хацеў: хто — кілбасамі, хто — аўсом, хто — марцыпанамі, хто цукеркамі. Мядзведзю асабліва рэпа спадабалася. Ён проста роў ад задавальнення, хоць вушы затыкай:

— Ды я за ўсё сваё мядзведжае жыццё такой рэпы не каштаваў! Салодкая, як мёд!»

Няхай жа і для вас, дарагія сябры, зімовыя святы пройдуць як найлепей — і ў кампаніі добрай беларускай літаратуры!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**




# Калядныя песні з Астрамечаўшчыны

**Выйшаў чацвёрты нумар штоквартальнага Брэсцкага раённага краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс».**

Выданне, якім апякуецца рэдактар і ўкладальнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр ВАЛКОВІЧ (а падтрымку яму найперш аказвае Брэсцкі райвыканкам), гэтым разам, пачынаючы з вокладкі, віншуе сваіх чытачоў з навагоднім святам. Друкуюцца калядныя песні, запісаныя ў вёсках Чэрск, Кавярдзякі, Кустын, Лышчыцы. А ў раздзеле «Народныя святы і звычаі Берасцейшчыны» — артыкул «Стояла ёлка, тонка, высока»: яліна ў фальклоры Берасцейшчыны». Нагадаем, што доктар філалагічных навук, кіраўнік лабараторыі «Фальклор і краязнаўства» Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Іна Швед — сталы аўтар «Астрамечаўскага рукапісу». Яе публікацыі — фальклорныя, этнаграфічны партрэт краю. І вельмі шкада, што наклад альманаха — усяго толькі 80 экзэмпляраў. Нягледзячы на яго рэгіянальна-краязнаўчы характар, выданне добра было б мець у кожнай бібліятэцы краіны. Такія медыйныя здабыткі, такія ўзоры перыёдыкі толькі ўзбагачаюць нашу краіну, даказваюць, што і на месцах, у рэгіёнах, у малых паселішчах жывуць унікальныя людзі, беларусы, якія захоўваюць народную спадчыну, нашу нацыянальную культуру.

Па традыцыі ёсць што пачытаць і ў раздзелах альманаха: «Астрамечава і астрамечаўцы», «Скарбніца народных талентаў», «Літаратурная сядзіба», «Кніжная зала», «Старонкі гісторыі», «Калаўрот культурнага жыцця», «Беларусь памятае».

А што да святочнай выявы на першай старонцы вокладкі, то гэта — рукавічкі з мастацкай вышыўкай Яны Сайтэ. А на чацвёртай старонцы вокладкі «Астрамечаўскага рукапісу» — святочны ручнік.

**Раман СЭРВАЧ.**

Усмешачку!

# ДЫ «ЗВЯЗДА» ЗАЎСЁДЫ ЧУЕ, ХТО КАГО ПЕРАЖАРТУЕ...

**Калі б гэтага конкурсу не было, яго, далібог, варта было б прыдумаць... Каб атрымаць ад чытачоў тысячы пісьмаў, каб падарыць мільёны ўсмешак, каб з дапамогай газеты адкрыць сотні талентаў, каб пакінуць у мове цэлы россып перлаў-залацінак, каб...**

**Сам сябе не пахваліш — так і памрэш.**

**Таму для нядаўніх чытачоў газеты «гістарычная даведка». Самы першы нечаканы ды смешны здымак з просьбай прыдумаць подпіс (не больш за восем радкоў) «Звязда» надрукавала гадоў 20 таму. Трохі пазней аб'явіла конкурс на найлепшы, стварыла журы, узнагародзіла пераможцаў, пераznаёміла, падружыла аўтараў...**

**Недахоп, як выглядала, быў хіба ў адным: здымкі ды найбольш удалыя варыянты подпісаў друкаваліся раней, аўтары самых-самых (у тым ліку пераможцы) называліся пазней...**

**І толькі ў апошнім нумары года «карціна» поўная. Такім чынам — выніковы агляд: конкурс «Хто каго?» 2021. Найлепшае». Каб «зацаніць» яго, калі ласка, уважліва паглядзіце на здымак, потым чытайце подпісы (крый божа, не ў гуглаўскім перакладзе на рускую мову).**

## «...ЗБЕГЛІ ДВОЕ НА ПРЫРОДУ, І НАЗАД НЕ КЛІЧЦЕ ІХ!»

*Гаспадыню Рэкс раўнуе:*
*Адпусці ў клуб такую, —*
*Стопудова — быць бядзе,*
*Нехта возьме і звядзе.*
*Той жа Янка сёння рана*
*Ужо ля лавачкі з баянам...*
**Зоя Наваенка, г. п. Падсвілле.**



*Не вясelle сустракалі,*
*Не гасцей з замежжа —*
*Дзетак з горада чакалі*
*Цэлы доўгі снежань.*
*А яны ўсё не едуць,*
*Бо пытаецца дачка:*
*Як вы там, бабуля з дзедам,*
*Ці калолі парсючка?*
**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

*Палюбіла я Івана —*
*Добра польку танцаваў!*
*Толькі вось адна загана:*
*Кожны вечар выпіваў...*
*А з п'яным якія скокі?*
*Хіба толькі «Падзі спаць»...*

*Ну й паслала...*
*Недалёка:*
*Лепей з цюцькам танцаваць!*
**Соф'я Кусянкова, в. Лучын, Рагачоўскі раён.**

*Нам прышчэпкі ад «кавід»*
*Раіць медыцына,*
*Але й танцы пад баян —*
*Файная вакцына!*

***

*Танцавала я з Валерам, —*
*Ногі потым — не пазнаць.*
*Чым такія кавалеры,*
*З цюцькам буду танцаваць!*
**Валерый Гаўрыш, г. Чавусы.**



## «ЧОРТ ПАДБІЎ ЗАВЕСЦІ ДАЧУ НА ДУРНУЮ ГАЛАВУ...»

*Мала рэчаў хлопцы ўзялі —*
*На два дні ўсяго паход.*
*А правізіі набралі,*
*Што хапіла б і на год!*
*Сала, бульбы, макароны,*
*Круп, згушчонкі і вяндліны...*
*Калі страўнік не галодны,*
*То... мілейшыя мясціны!*
**Віктар Сабалеўскі, г. Узда.**

*Як цудоўна быць турыстам,*
*Начаваць пад небам чыстым,*
*Песні весела спяваць*
*І душой адпачываць.*
*...Быць карысна й бульбаводам,*
*Пчаляром,*
*жывёлаводам.*
*Бо калі пусты жывот,*
*Не захочацца*
*ў паход.*
**Мікалай Старых, г. Гомель.**

*Ясь адкрыў у вёсцы*
*краму,*
*Гандляваў...*
*І без падману...*
*Палічыў*
*пасля выдаткі, —*
*Няма сэнсу ў занятку,*
*Бо арэнда, бо крэдыты*
*Душаць горай за бандытаў.*
*А таму наш Ясь цішком*
*Зарабляе чаўнаком.*
**Любоў Чыгрынава, г. Мінск.**

*Чорт падбіў завесці дачу*
*На дурную галаву,*
*Я за ёй жыцця не бачу*
*І ўжо кінуць не магу!*
**Іван Астроўскі, г. Мінск.**

*У бутэльку цётка Света*
*Зазірае ўсё часцей.*
*Муж не вынес усё гэта*
*І сышоў...*
*Забраў дзяцей.*
**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

## «ЁН НА ТОЕ І ЛІПЕНЬ, КАБ ДА ДЗЕВАК ЛІПНУЦЬ...»



*Ясь — дзяцюк не малады...*
*Глянуў — дзеўка ля вады*
*Нічыя і модная...*
*Ды як лёд халодная!*
*Нецікава абдымаць...*
*Толькі й можна, што здымаць.*
**Мікалай Касмачэўскі, г. Наваполацк.**

*Муж абняў русалку?*
*Не зважае Алка,*
*Бо нічога ў іх... Наўпрост:*
*Там хіба што рыбін хвост.*
**Соф'я Кусянкова, в. Лучын, Рагачоўскі раён.**

*У адстаўцы...*
*Афіцэр...*
*І не зломак быццам...*
*Ды, як польскі кавалер,*
*Не бяжыць жаніцца.*

*За жыццё ён перабраў*
*Маладзіц нямала*
*«Вось такую б, кажа, узяў,*
*Каб яшчэ*
*й маўчала».*
**Віктар Сабалеўскі, г. Узда.**

*Ён на тое і ліпень,*
*Каб да дзевак ліпнуць.*
*А зімою мужычок*
*Шусь да жонкі пад бачок...*
*Бо русалка ёсць русалка:*
*Не абдыме гэтак палка.*
**Любоў Чыгрынава, г. Мінск.**

## «ЖОРА КОЛА ВЫМЫЎ ЧЫСТА І НЕ ТРЭБА МАСАЖЫСТА...»



*Дзве педалі ў раварыста,*
*Дзве педалі ў шафёра...*
*Першы, бач, які плячысты:*
*Хоча ехаць — круціць колы.*
*А другі сядзіць, таўсцее...*
*Болей ездзіць, больш хварэе.*
**Валерый Гаўрыш, г. Чавусы.**

*Як цаглінка да цаглінкі —*
*Можна домік збудаваць,*
*Гэткім чынам і машынку*
*Янка вырашыў сабраць.*
**Сужэнцы Астроўскія, г. Мінск.**

*Ў раварыста не спытацца,*
*Куды чэрці павялі...*
*Пэўна, ён сваёй каханцы*
*Рамантуе «Жыгулі».*
**Эльяш Банель, г. Мінск.**

*Юлька — дзеўка не дурная,*
*Кавалераў прывячае:*
*Той, хто едзе ці ідзе,*
*Ёй хоць нешта ды вязе!*
**Ніна Бурко, в. Капланцы, Бярэзінскі раён.**

*Дзядзька Жора малайчына,*
*Раз'язджае важна, чынна,*
*Прычапіўшы ззаду кола,*
*Каб у спіну не калола.*
*Паглядзіце: вымыў чыста, —*
*І не трэба масажыста.*
*Без бальніц і трэнажораў*
*Сам сябе ратуе Жора.*
**Любоў Чыгрынава, г. Мінск.**

## «УЦЯКАЎ ІВАН ТАК ШПАРКА АД СЯМ'І, АД ГАСПАДАРКІ...»

*Прыляцелі гусі з броду,*
*Скалацілі ў рэчцы воду,*
*Не збаяўся дзед вады.*
*Ён сказаў: «Такой бяды!»*
*...Каб яшчэ й трусы надзеў,*
*Можа б, ён яе й не меў?*
**Зоя Наваенка, г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.**



*Накасіўшыся, Ясей*
*Углядаецца ў гусей:*
*Маўляў, з яблыкам адну*
*Прыгатую і ўмну!*
*... Дам, браток, табе параду:*
*Не марнуй у рэчцы час.*
*Гуска — страва на Каляды —*
*А цяпер гуркі якраз.*
**Валерый Гаўрыш, г. Чавусы.**

*Змалку марыў Ясь пра мора —*
*Неабсяжныя прасторы,*
*Узбярэжжы, пляжы, дамы...*
*Ёсць жа — сажалка з гусямі...*

*Ды ці варта наракаць?*
*Трэ што маеш шанаваць!*
**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

*Уцякаў Іван так шпарка*
*Ад сям'і, ад гаспадаркі.*
*Думаў збегчы ад Марусі...*
*Ды яго спынілі гусі:*
*— Ты куды гэта, Вано?*
*Не кармію ты нас даўно...*
*Брыдка стала Янку тут,*
*Што хацеў пакінуць кут:*
*Калі есці просяць гусі,*
*Тады ну яе з Марусяй!*
**Таццяна Новік, г. Клецк.**

## «ЖЫГУЛІ» ЎЖО АДЖЫЛІ, ІМ НА ЗМЕНУ — «ДЖЫЛІ?»

*Татка наш купіў аўто!*
*Ён цяпер не абы хто:*
*Ён кіроўца, ён персона!*
*Хоць машына*
*не з салона,*
*А з дзясятых,*
*можа, рук, —*
*Нос па ветры. І ў гару!*
**Віктар Сабалеўскі, г. Узда.**



*З вокнаў зырылі суседзі —*
*На машыне (?) Рома едзе?*
*— Быць не можа,*
*каб прыдбаў!*
*— Мо пазычыў?*
*— Ну не ўкраў!*
*— На пракат узяў у цёткі?...*
*Не пляцiце, людзі, плёткі:*
*На камбайне*
*першым стаў —*
*«Жыгулі» і атрымаў.*
**Зоя Наваенка, г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.**

Вельмі файная машына:
Усё на месцы, чын па чыну,
І бензіну поўны бак,
А завесці... Ну ніяк!

***

*Лёс жалезнага каня*
*Вырашае ўся радня:*
*Ці прадоўжыць*
*яму жытку,*
*Ці ўжо выкінуць з ужытку?*
**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

*Ясь не скажа вам*
*дакладна,*
*Колькі ездзіць*
*гэта «Лада»,*
*Але ж бачна — «Жыгулі»*
*«Падманулі, падвялі»:*
*Нехта міма прэцца*
*з шыкам,*
*А яго паездка — пшыкам...*
**Сужэнцы Астроўскія, г. Мінск.**

## «ХОЦЬ І МАРЫЎ ПРА КІТА, ДЫ ЛАВІЎ ЯСЬ... ДЛЯ КАТА»



*У любімай у рыбалцы*
*Кожны мае інтарэс:*
*Хто ляшча смакуе ў шмальцы,*
*Для каго важней працэс...*
**Аляксандр Матошка, в. Янкавічы, Расонскі раён.**

*Вабіць дзядзькаў тонкі лёд,*
*Нібы вос разліты мёд...*
*Мо ў палонцы лепей часам,*
*Чым у жонкі пад абцасам?*
**Мікалай Старых, г. Гомель.**

*Янка гэтак... Янка так...*
*Бач, не ловіцца шчупак!*
*Можа, ён на дне, унізе?*
*Падкажу: «У Чырвонай кнізе».*
**Зоя Наваенка, г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.**

*Хай мароз і хай завея!*
*Ды рыбак жыве з надзеяй.*
*У палонку пазірае:*
*Раптам клюне залатая?*
**Валянціна Гудачкова, г. Жыткавічы.**

**Чарговы конкурсны здымак (з мужчынкам на коле БелАЗа) надрукаваны 24 лістапада. Не дзіва, што многія з чытачоў ужо выканалі дамашняе заданне — даслалі свае варыянты подпісаў. Нехта яшчэ дашле. А значыць, конкурсу быць? Пішыце! Свет захаваўся, таму што смяюся. І думаў.**

**Валянціна ДОЎНАР, са шчырай удзячнасцю да ўсіх, хто піса (і, магчыма, будзе), да ўсіх, хто чытаў.**

# СЛЕД ТЫГРА

## У чым сустракаць Новы год і што надзяваць, калі ён уступіць у свае правы

**Зусім хутка да нас прыйдзе самае чароўнае свята. Новы год, вядома, як сустрэнеш, так і правядзеш. Такім чынам, надышоў час не толькі вызначыцца з навагоднім вобразам, але і звярнуць увагу на трэнды модных сезонаў.**

### Што будзем насіць?

Пачнём з таго, што ж будзе модна, калі прагучаць усе навагоднія тосты, скончыцца шампанскае і наступяць будні-2022. Год Тыгра падорыць модніцам велізарную разнастайнасць трэндаў: на подыумах і вуліцах будуць мірна суіснаваць аверсайз і прыталеныя сілуэты, пастэльныя і яркія тоны, мінімалізм і акцэнтнасць. Што ж стане musthave ў гардэробе модніцы?

**Год Тыгра пачынаецца з навагодняй ночы: галоўнымі яе колерамі (у сувязі з колерам «нябеснага звера» па ўсходнім гараскопе) чакана будуць блакітны (сіні, бірузовы) і чорны.**

***Касцюм-тройка ці двойка.*** Белы. Менавіта ў гэтым колеры ён будзе найбольш актуальны ў 2022 годзе. Не занадта практычна, затое як эфектна! Актуальныя мадэлі — крыху аверсайз. ***Скарочаны пінжак*** будзе безумоўным трэндам: дадасць у вобраз гуллівасці і візуальна зробіць стан танчэйшым. Але забытыя на антрэсолях прыталеныя варыянты мінулых гадоў не падыдуць: сілуэт павінен быць актуальны.

***Падшываныя паліто, курткі і плашчы*** — трэнд, які пачаўся ў гэтым годзе, нікуды не дзенецца і ў наступным. І затрымаецца яшчэ на некалькі сезонаў. Тое ж самае датычыцца і ***трыкатажных камізэлек:*** узняўшыся на модны Алімп гэтай восенню, яны застануцца з намі будучай вясной. Аверсайз-мадэлі нейтральных адценняў ужо перамясціліся з акцэнтных рэчаў у базавы гардэроб. Гэтак жа, як і чароўныя і ўтульныя ***трыкатажныя сукенкі*** аверсайз, а даўжыня — ад міні да максі. З прыходам цёплых дзён на піку будуць трыкатажныя «двойкі» з топу і спадніцы. Трыкатаж наогул застаецца сярод фаварытаў стрытстайлу. Надыходзячы год актывізуе світары з махрамі, а вострамодныя зараз паласатыя стануць базай. Будучай вясной модніцы пачнуць насіць ***кароткія аб'ёмныя паліто.*** Камбінаваць іх рэкамендуецца з міні і джынсамі-скіні. Сілуэт няпросты: лёгка памыліцца і паўстаць у выглядзе бочачкі на ножках. Але калі «ўпісаць» у сваю знешнасць трэнд правільна, выява атрымаецца вельмі стыльнай.

А наогул, аверсайз паступова сыходзіць.

— Бум вялікіх рэчаў быў мінулай зімой, — адзначае **дызайнер Ірына ГРЫЦУК.** — Цяпер трэнд сціхае, бо ад 1980—1990-х, якімі дызайнеры натхняліся ў гэтым сезоне, мода рухаецца ў бок 1970-х. А гэта акцэнт на талію і падкрэсліванне фігуры.

Ужо наступнай вясной у моду вернуцца ***прыталеныя аблягаючыя сукенкі.*** Трэнд патрабуе асцярожнага да сябе стаўлення. Сукенку лепш выбіраць мінімалістычную, без празмернага дэкору.

***Батфорты*** застаюцца на модным Алімпе. Найбольш актуальныя — без абцаса.



Гэта выклік вашаму добраму густу і ўменню адэкватна ацаніць сваё адлюстраванне ў люстэрку. Калі ногі кароткаватыя, такія батфорты — не ваш варыянт. Але ёсць і добрая навіна: трыумфальнае вяртанне трэнду з нулявых — ***абутку на платформе і абцасе.*** Гэты трэнд калісьці любілі ўсё без выключэння, таму што ў іх любая постаць здаецца мадэльнай, а самыя звычайныя ногі — хвалююча-доўгімі. Зразумела, гэта будуць батыльёны, а з прыходам цяпла — і элегантныя «Мэры джэйн».



### Год пачынаецца... з ночы

Год Тыгра пачынаецца з навагодняй ночы: галоўнымі яе колерамі (у сувязі з колерам «нябеснага звера» па ўсходнім гараскопе) чакана будуць блакітны (сіні, бірузовы) і чорны. Таксама актуальныя тыгрыныя жоўты, аранжавы, пясочны. Вітаюцца шэры і белы, серабрысты і залаты. Інстытут колеру Pantone назваў колерам наступнага года сіні адцення Veri Peri (ён жа «перванш», «барвінак»). Мастакі зразумеюць. Калі ж вы не мастак, то ведайце, што гэта сіні, які нясе ў сабе фіялетава-чырвоны падтон. Ну, а стылісты самым модным колерам гэтай зімы вырашылі зрабіць зусім не зімовы глыбокі, насычаны зялёны. Традыцыйныя для вячэрніх выхадаў чырвоны і фіялетавы сёлета дызайнеры не шануюць, ды і Тыгр іх не любіць. Затое Тыгр не супраць ***стразаў і паетак*** — неад'емнай часткі любой навагодняй вечарынкі. Імі зараз упрыгожваюць сукенкі, спадніцы, топы і нават супрацьэпідэмічныя маскі — не кажучы ўжо пра біжутэрыю. Застацца ўбаку ад гэтага бліскучага вар'яцтва? Лепш удумліва скласці святочны look. І тут вячэрняя мода-22 бачыць два варыянты: можна утрыраваць вобраз, узмацніўшы бляск паетак пры дапамозе скуры і глянцавых фактур, бліскучых упрыгожванняў і яркіх тонаў. А можна вытрымаць баланс, дапоўніўшы акцэнтную рэч з паеткамі простымі базавымі элементамі і аксесуарамі. Менавіта так, дарэчы, стылісты раяць упісваць бліскучыя рэчы ў паўсядзённыя лукі. Амаль ва ўсіх брэндаў мас-маркета, прадстаўленых у нашай краіне, напрыклад, можна знайсці спадніцу ў паетках — добры варыянт для стварэння навагодняга вобраза. Актуальны высокі бакавы разрэз. Упісаць такую спадніцу ў паўсядзённы гардэроб можна, калі злучаць са світарам грубай вязкі або базавым пінжаком.

**Бум вялікіх рэчаў быў мінулай зімой. Цяпер трэнд сціхае, бо ад 1980—1990-х, якімі дызайнеры натхняліся ў гэтым сезоне, мода рухаецца ў бок 1970-х. А гэта акцэнт на талію і падкрэсліванне фігуры.**

***Сукенка*** — правераны часам святочны варыянт. Максі ў падлогу з адкрытымі плячыма пакінем за дужкамі, калі, вядома, вас не запрасілі на сустрэчу Новага года ў Букінгемскі палац. Хоць ***акцэнт на плечы*** — гэта адназначна адзін з трэндаў. Сукенкі, якія адкрываюць плечы, модныя дамы і мас-маркет прадстаўляюць і ў больш дэмакратычнай даўжыні мідзі (ёсць варыянты з міні, але гэта, мабыць, перабор). Асабліва шляхетна сукенкі, якія адкрываюць плечы, выглядаюць на стройных дзяўчатах з доўгай шыяй і выступаючымі ключыцамі. Але падыдуць і ўладальніцам распаўсюджанага тыпу фігуры «груша» (пышныя сцёгны і вузкія плечы). У гэтым сезоне найбольш трэндавым лічыцца спалучэнне адкрытых плячэй і доўгіх рукавоў. Напаўпразрыстыя рукавы сукенак, актуальныя гэтай зімой, і рамантычныя міні з рукавамі-буф — таксама пра акцэнт на плечы.

**Аверсайз-мадэлі нейтральных адценняў ужо перамясціліся з акцэнтных рэчаў у базавы гардэроб.**

Актуальныя ***сукенкі-футляры.*** Ідэальны варыянт (калі фігура дазваляе) — на маланцы. Нават калі вам ад прыроды дасталіся 90-60-90 і высокі рост, лепш усё ж выбіраць шчыльную тканіну — такая сукенка выдатна «збірае» постаць, а маланка візуальна страйніць. У штодзённасці пад яе можна апранаць лонгсліў ці вадалазку. У трэндзе сукенкі-мідзі з расклёшаным падолам, якія падкрэсліваюць стан, а таксама сукенкі з плісіроўкай. Адзін з трэндаў вячэрняй моды — драпіроўка. Яна спалучаецца з рознай даўжынёй і — дарэчы! — дапамагае прыхаваць б'юці-праблемы ў раёне таліі і жывата.



Яшчэ адзін безумоўны трэнд — ***напаўпразрыстыя элементы і ўстаўкі.*** І тут таксама два шляхі: для паненак адважных і для абачлівых. Першы шлях — цалкам празрыстая сукенка з шыфону, фаціну, арганзы або сеткі. Носяць яе... не, не на голае цела, а на іншую сукенку (як у сярэднявеччы). Але ў XXI стагоддзі падніз апранаюць сукенку-камбінацыю (або бодзі, але гэта экстрэмальна). Дарэчы, выдатнай альтэрнатывай сукенцы на Новы год стане шыфонавая напаўпразрыстая блуза ў спалучэнні са штанамі-палацца. Ну, а другі шлях — гэта павысіць градус трэндавасці свайго навагодняга вобраза, проста дадаўшы ў яго напаўпразрысты элемент: тыя ж рукавы.

Маленькая ***чорная сукенка*** — ну, зразумела! А ў гэтую навагоднюю ноч яна — яшчэ і рэверанс заступніку надыходзячага года. Аксамітныя і карункавыя, мідзі з запахам і прыталеныя, максі з акцэнтам на плечы — любыя чорныя сукенкі на грэбні моднай хвалі. Манахромны вобраз можа таксама быць і белым, але тут вялікая небяспека выглядаць як нявеста, што ўцякла з вяселля. З чорным колерам таксама ўсё не проста. Як вядома, ён пасуе паннам з кантраснай знешнасцю — чорнымі бровамі, цёмнымі вачыма і валасамі. «Акварэльная» прыгажосць славянскіх дзяўчат патрабуе хутчэй светлых адценняў. Але чорны — у трэндзе, выглядае эфектна і візуальна падцягвае фігуру. Што робім? Самы просты шлях — дыстанцыяваць чорны ад твару. Няхай чорным будзе ніз. Калі ўсё ж патрэбны і чорны верх, выбіраем не глухія, а адкрытыя фасоны (V-падобны выраз, агаленыя плечы, нават закатаныя або кароткія рукавы палегчаць вобраз). Таксама памятаем, што на ўспрыманне чорнага ўплывае фактура тканіны. Глянцавая паверхня ўзмоцніць эфект, матавая — згладзіць. Змякчаць успрыманне чорнага і лёгкія, тонкія тканіны — шыфон або карункі.

І, вядома, сёлета для святкавання Новага года падыдзе ***ўбор у палоску*** — вертыкальную, гарызантальную, дыяганальную, а таксама ***тыгровы прынт.***

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**



# ШТО АБЯЦАЮЦЬ ЗОРКІ

**Запальчывасць і зменлівасць — ключавыя рысы характару заступніка надыходзячага 2022 года, Чорнага Вадзянога Тыгра. У свае правы Тыгр уступіць 1 лютага, і з гэтага дня мы ў поўнай меры адчуем яго нораў. Ды і колер надыходзячага года — чорны або сіні — сімвалізуе нестандартнае мысленне і рашучасць. Зрэшты, водная стыхія змякчыць непрадказальны характар Чорнага Тыгра, сцвярджаюць астролагі. І сюрпрызы ўсіх нас чакаюць усё ж у асноўным прыемныя. Наступны год — час смелых рашэнняў, але ўсе яны павінны быць папярэдне сур'ёзна абдуманыя.**

## АВЕН



2022 год падорыць вам магчымасць праявіць сябе ў той сферы, у якой вы захочаце. Але агрэсіўнасць (характэрная рыса знака) у надыходзячым годзе можа стаць прычынай сур'ёзных няўдач. Прымайце рашэнні, кіруючыся логікай і здаровым сэнсам. Але калі ў вас ёсць даўняя мара, якую вы многія гады адкладвалі на потым, менавіта ў 2022 годзе варта ператвараць яе ў мэту і пачаць упарты рух да яе. У гэтым выпадку зоркі будуць дапамагаць кожнаму вашаму кроку. Для адзінокіх найбольш спрыяльнымі перыядамі акажуцца лета і ранняя восень — менавіта ў гэты час вялікая верагоднасць сустрэць сваё каханне. Пошук партнёра на рабоце — няўдалая ідэя? Тыгр здолее пераканаць вас у адваротным. Што датычыцца фінансавай сферы, заступнік года ўзмоцніць матэрыяльную сферу знака і адкрые перад ім новыя крыніцы даходу.

## ЦЯЛЕЦ



Вас чакае мноства прыемных падзей. Галоўнае месца ў вашым жыцці ў наступным годзе будзе займаць работа, з'явяцца прычыны паглыбіць веды ды атрымаць новыя навыкі. Найбольш напоўненай падзеямі будзе першая палова надыходзячага года. Гэта час перамен і новых пачынанняў. З вашага жыцця паступова сыдуць людзі, з'явы і падзеі, якія не прыносяць радасці. Галоўнае — спрабуйце новае, наладжвайце новыя кантакты, дзелавыя і сяброўскія. Не бойцеся брацца за няпростыя задачы, бо такі шлях хоць і цяжкі, затое цікавы і прадукцыйны. Пошукі кахання ўвянчаюцца поспехам. Фінансавае становішча Цяльца палепшыцца: гэта звязана з яркай астралагічнай падзеяй — «абуджэннем» Венеры, планеты задавальненняў, прыгажосці і грошай. У год Вадзянога Тыгра Венера ўвойдзе ў сілу і абрыне на Цяльцоў свае даброты.

## БЛІЗНЯТЫ



Надыходзячы год можа падарыць Блізнятам моцнае, але нераздзеленае пачуццё. Зоркі раяць успрымаць цяжкасці як магчымасць для самаўдасканалення і пошуку сябе. Але ў цэлым 2022 год для Блізнят будзе яркім і напоўненым пазітывам. Магчыма, вам прыйдзецца выйсці з зоны камфорту — змяніць работу, сферу дзейнасці або месца жыхарства, але ў канчатковым выніку ўсё будзе да лепшага. Рабочыя пытанні ў надыходзячым годзе Блізнятам важна вырашаць напорыста і мэтанакіравана, і тады фінансавы дабрабыт не прымусіць сябе чакаць. У 2022 годзе многія прадстаўнікі гэтага знака знойдуць сваю «палавінку», а шлюбны саюз прынясе шчасце і эмацыянальную бяспеку. Ад тых, хто ўжо знайшоў сваё каханне, год Тыгра запатрабуе цярпення і ўмення ісці на кампрамісы.

## РАК



Тыгр не раз здзівіць прадстаўнікоў гэтага знака. Падзеі будуць развівацца неверагодна хутка, а перамены закрануць літаральна ўсе важныя сферы жыцця. Але па выніках года, сцвярджаюць астролагі, Ракі здабудуць гармонію ў адносінах, мір у сям'і і дакладнае ўсведамленне мэт, якіх хочуць дасягнуць. Не чакайце цудаў, дзейнічайце рашуча і ўпэўнена — і зоркі дапамогуць вашаму кар'ернаму росту. Фінансавыя пытанні ў 2022 годзе будуць з'яўляцца радзей, чым у 2021-м, і ўсё ж у фінансавым плане год у Ракаў будзе складаным. Вучыцеся эканоміць, назапашваць зберажэнні, абдумвайце кожную пакупку. Так вы зможаце стабілізаваць сваё матэрыяльнае становішча. У цэлым, менавіта для прадстаўнікоў гэтага знака год Тыгра стане пераломным і вызначальным. Калі вы даўно не маглі перасягнуць нейкую перашкоду, надыходзячы год падорыць вам свабоду дзеянняў.

## ЛЕЎ



Нялёгкі шлях, якім ішлі Львы ў апошнія гады, ператворыцца нарэшце ў роўную дарогу: вас чакаюць шчасце і росквіт. Праблемы не знікнуць, але яны будуць знаходзіць вырашэнне, часам нават без вашых намаганняў. Працягвайце рухацца наперад, і ўжо ў сакавіку заўважыце, што працэс даецца лягчэй і прыносіць усё больш плёну. Памятайце: у гэтым годзе лёс добразычлівы да вас, і не бойцеся ставіць сабе высокую планку. Асабліва калі вы — прадстаўнік творчай прафесіі: менавіта творчых людзей апякуе Вадзяны Тыгр. Так што адмоўцеся ад стэрэатыпаў, не жывіце чужым меркаваннем і не перастаўайце вучыцца. Вас чакаюць кар'ерныя вышыні, цалкам верагодна — новае каханне і пазбаўленне ад фінансавых цяжкасцяў. Сямейныя Львы здабудуць, нарэшце, мір і гармонію.

## ДЗЕВА



Пройдзены ў мінулыя гады шлях Дзеў прывядзе да поспеху ў 2022 годзе. Зрэшты, надыходзячы год запатрабуе ад прадстаўнікоў знака ўсіх сіл, але і шчодра ўзнагародзіць — і фінансава, і поспехамі ў прафесіі. Непазбежна прыйдзецца чымсьці ахвяраваць у імя сваіх задум. Зоркі раяць, аддаючы час кар'еры, не пакідаць без увагі сям'ю — вашы хатнія будуць мець патрэбу ў вас. Вельмі важна ў будучым годзе навучыцца заўважаць не толькі свае мінусы, але і плюсы, а таксама — час ад часу даваць сабе перадышку ад работы: ваша сям'я стане месцам вашай сілы. У адзінокіх Дзеў усе шанцы сустрэць сваё каханне ў 2022 годзе. У цэлым, Дзева ў год Тыгра зможа бліскуча аналізаваць схаваныя працэсы і атрымліваць тое, што даступна не кожнаму. Год будзе прыхільны да прадстаўнікоў гэтага знака, але не забывайцеся дзякаваць лёсу.

## ШАЛІ



Для вас надыходзіць час пераасэнсавання каштоўнасцяў. Асабліва гэта датычыцца кахання і сям'і, але вам прыйдзецца шукаць глабальныя сэнсы і ва ўсіх іншых сферах свайго жыцця і адказваць сабе на пытанні «Навошта я гэта раблю?» і «Да чаго на самай справе імкнуся?». Заступнік года будзе добры да вас, калі вы дадасце ў сваё жыццё больш адказнага стаўлення да справы і не будзеце кідаць пачатае на паўдарогі. Год Тыгра праверыць многіх прадстаўнікоў знака на трываласць. Але калі вы не будзеце здавацца, праявіце сабранасць і мэтанакіраванасць, 2022 год стане для вас самым прадукцыйным з апошніх гадоў — і ў фінансавым, і ў кар'ерным планах. У адносінах паўстане момант, калі вам спатрэбіцца зняць ружовыя акуляры і прыняць, нарэшце, і бытавую руціну, і неабходнасць падладжвацца адзін пад аднаго ў пары. Адзінокія Шалі змогуць уступіць у шлюб, калі перастануць чакаць ідэальных адносін.

## СКАРПІЁН



Скарпіёны ў 2022 годзе адназначна стануць багацейшыя. Увесь год іх даходы будуць пастаянна расці. Не забывайце адкладваць на чорны дзень, бо жыццё паласатае. Ва ўсіх сферах ваш галоўны саюзнік у надыходзячым годзе — інтуіцыя. Менавіта яна дапаможа пазбегнуць непрыемнасцяў і прасунуцца ўверх па кар'ернай лесвіцы. Можаце змяніць сферу дзейнасці або паглыбіцца ў раней выбраную сферу — у любым выпадку вынік будзе выдатны. На асабістым фронце ўсё будзе ярка, эмацыянальна, бурна. Сямейным Скарпіёнам зоркі раяць у гэтым годзе стрымліваць свае негатыўныя парывы і ўтаймаваць тэмперамент, каб не разбурыць тое, што дорага вам і вашаму партнёру. Адзінокім Скарпіёнам варта прыглядзецца да людзей у найбліжэйшым атачэнні — раптам ваш лёс проста побач з вамі?

## СТРАЛЕЦ



Стральцам надыходзячы год падорыць поспех. Зоркі абяцаюць мноства незабыўных уражанняў. Падзеі ўжо са студзеня пачнуць разгортвацца неверагодна хутка. Тыгр стане Стральцам сябрам і саюзнікам, дапаможа рэалізавацца самым дзёрзкім планам і ўвасобіць у рэальнасць мары. Асабліва калі прадстаўнікі знака не будуць чакаць ласкі ад прыроды і пачнуць ажыццяўляць мары сваімі сіламі. Стральцы перастануць сумнявацца ў сваім прафесіяналізме, прыйдуць і кар'ерны, і матэрыяльны поспехі. Але калі не навучыцца эканоміць і адкладваць грошы, Тыгр можа перакрыць фінансавы струмень. А вось у адносінах вас чакае зацішша — год не абяцае Стральцам стварэння новых любоўных саюзаў. І для змены работы і сферы дзейнасці час неспрыяльны — калі рашыцеся, прыйдзецца складана. Лепш развіваць кампетэнцыі ў сваёй прафесійнай сферы, і поспех прыйдзе досыць хутка.

## КАЗЯРОГ



Будучы год падрыхтаваў Казярогам два сцэнарыі — вельмі добры і... не вельмі: па якім з іх будуць развівацца падзеі, залежыць ад прыкладзеных вамі намаганняў. У прафесійнай сферы першая паўгода магчымы поўны кавардак. А вось адносіны зайграюць новымі фарбамі, у ваша жыццё прыйдуць новыя знаёмствы, і, магчыма, новае каханне. Зоркі раяць Казярогам у новым годзе пазбягаць канфліктаў на рабоце і ў сям'і. Памятайце, калі вас крытыкуюць, значыць, ёсць чаму пазайздросціць. Яшчэ адна парада — мяняйце сферу дзейнасці, калі яна перастала вас задавальняць. Паглыбляйце веды і атрымлівайце новыя, змяняйцеся да лепшага, і Тыгр вас падтрымае. Вы не адразу зможаце ўлавіць сапраўдны сэнс і значэнне падзей, якія падорыць вам 2022 год, але пасля абавязкова будзеце дзякаваць за іх лёсу.

## ВАДАЛІЎ



У 2022 годзе Вадаліваў чакаюць радасныя падзеі. Сімвал года будзе спрыяць вашаму росквіту. Але поспех усміхнецца толькі тым, хто гатовы дзейнічаць і валодае актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Асабліва спрыяльны надыходзячы год для прафесійнага росту. Больш за ўсіх поспех чакае тых прадстаўнікоў знака, хто працуе ў сферы юрыспрудэнцыі, інжынерыі і будаўніцтва. Ці прыйдзе фінансавы дабрабыт, у першую чаргу залежыць ад вашага жадання працаваць: работа без жадання не прынясе сур'ёзных дывідэндаў. У адносінах зоркі раяць прыцішыць эмацыянальнасць і часцей прыслухоўвацца да халоднай логікі. І тады сямейныя Вадалівы здолеюць дасягнуць міру і гармоніі.

## РЫБЫ



2022 год запомніцца Рыбам назаўсёды — іх чакае чарада эпахальных падзей, параўнальных па сваёй значнасці хіба з нараджэннем дзіцяці. Год, дарэчы, менавіта для Рыб якраз спрыяльны для нараджэння дзяцей. Як і для новых здзяйсненняў. Ужо ў студзені вы адчуеце ў сабе сілы кардынальна змяніць сваё становішча ў грамадстве. Магчымыя змена работы, развод або, наадварот, уступленне ў шлюб. Многія недасяжныя вяршыні акажуцца раптам на адлегласці выцягнутай рукі, у тым ліку ў вырашэнні фінансавых пытанняў. Даўнія крыўды застануцца ў мінулым. Будзьце гатовы ўпусціць у сваё жыццё тых, каго ніколі не планавалі ўбачыць. І памятайце: усё, што адбудзецца ў 2022 годзе, у канчатковым выніку прынясе вам шчасце і дабрабыт. Год пройдзе пад заступніцтвам стыхіі вады, і Рыбы будуць адчуваць сябе менавіта «як рыбы ў вадзе»!

# НОВЫ ГОД — К ВЯСНЕ ПАВАРОТ



**Па гарызанталі: 2.** «З Новым годам, з шчасцем новым!». З верша Я. Коласа «На Новы ... ». 3. Старая назва некаторых каштоўных камянёў. 5. Новы год — к вясне ... (*прык.*). 8. Дзе ... , там і клад (*прык.*). 9. Вялікае лісцевае дрэва. 10. Лепш памерці як тыгр, чым пражыць жыццё як ... (*прык.*); з 1-га лютага, паводле ўсходнеазіяцкага календара, пачынаецца год Тыгра. 11. «І сняжынкі карагодам // Апускаюцца на ... ». З верша Р. Рэўтовіч «Снег». 12. «Тут і ... , і рак, і пчолка, // І мядзведзь, і воўк з лісой». З верша І. Шуцько «У навагодні вечар». 14. ... і каза на адным беразе п'юць ваду (*прык.*). 16. ... мядзведзі ў адной бярлозе не ўжывуцца (*прык.*). 19. ... або Васілле; народная назва старога Новага года, які адзначалі 14-га студзеня. 20. «У дзяцей звіняць ... // Каля самай ёлкі». З верша М. Смагаровіча «Перад Новым годам». 21. Цяжы, што ідуць ад канца аглоблі да загваздкі. 23. ... на лета, зіма на мароз (*прык.*). 25. «... , лыжы ды канькі — лепшая ўцеха ». З верша Я. Сідарэнкі «Зіма». 27. Тое, што і небыліца. 28. Зімні ... з вераб'іны скок (*прык.*). 30. «Дзед Мароз, чырвоны нос, // ... дзеткам нёс». З верша У. Мацвеенкі «Следапыт». 31. «... стварыў кошку для таго, каб у чалавека быў тыгр, якога можна пагладзіць». В. Гюго.

**Па вертыкалі:** 1. З мёдам і ... праглынеш (*прык.*). 3. Рэчаіснасць. 4. Попел (*разм.*). 6. «Я сардэчна, ад душы, // Вас віншую, ... !». З верша К. Крапівы «З Новым годам!». 7. «Хай новы дзень і новы час // Змяце ў мінулае ... !». З верша Т. Дзям'янавай «З Новым годам!». 13. ...-маскарад. Навагодні касцюміраваны вечар з танцамі і забавамі. 14. ... лані, а сэрца тыгра (*прык.*). 15. «Што за дзіва — на ўва ёлка! // Што за ... — Новы год!». З верша М. Чарняўскага «Ёлка-вясёлка». 17. Не пужай, зіма, ... прыйдзе (*прык.*). 18. Цыкл мастацкіх твораў аднаго жанру. 22. «Лыжа ліжа белы снег, \\ На лыжні — вясёлы... ». З верша А. Дзяружынскага «Першы снег». 23. Прадукт, які ўжываецца для вырабу квасу, піва. 24. ... дасужы, ды не дужы (*прык.*). 26. Роды ў каровы, самкі лася, аленя. 29. «Пахаваліся дамы // Пад ... савы-зімы». З верша Л. Воранавай «Зімняя казка».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 2. Год. 3. Яхант. 5. Паварот. 8. Лад. 9. Вяз. 10. Мыш. 11. Доп. 12. Грыб. 14. Тыгр. 16. Два. 19. Васіль. 20. Канькі. 21. Атосы. 23. Сонца. 25. Санкі. 27. Небыль. 28. Дзянёк. 30. Падарункі. 31. Бог.
**Па вертыкалі:** 1. Долата. 3. Ява. 4. Тло. 6. Малышы. 7. Нягоды. 13. Баль. 14. Тавр. 15. Свята. 17. Вясна. 18. Нізка. 22. Смех. 23. Солад. 24. Адзін. 26. Ацёл. 29. Крыло.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.57 | 7.29 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.39 | 7.14 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.47 | 7.28 |
| Гомель — | 9.07 | 16.52 | 7.45 |
| Гродна — | 9.42 | 17.14 | 7.32 |
| Брэст — | 9.34 | 17.23 | 7.49 |

### Месяц

*Апошняя квадра 27 снежня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

**Пр.** *Зоі, Мадэста, Марка, Міхаіла, Сімяона.*
**К.** *Меланії, Сільвестра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 31 СНЕЖНЯ

**У краіне**

**1896** год — у Мінску запрацавала тэлефонная станцыя агульнага карыстання — першая ў Беларусі. Да тэлефоннай сеткі было падключана 57 апаратаў, якія належалі 53 абанентам. Агульная працягласць ліній склала 12 вёрстаў 114 сажняў (сажань — 2,1 метра). Тэлефоннай сувяззю карысталася вузкае кола заможных гараджан. Плата за абанемент у радыусе да дзвюх вёрстаў ад тэлефоннай станцыі вызначалася ў 75 рублёў, а далей да гэтай сумы дабаўлялася на кожную вярсту па 15 рублёў.

**1920** год — на 2-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў упершыню ў рамках палітыкі беларусізацыі заяўлена аб неабходнасці пераводу жыцця рэспублікі на родную мову яе народа.

**1986** год — утвораны Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». Фонды музея складаюць калекцыі археалагічных знаходак з раскопак на тэрыторыі горада і яго наваколля, узораў ткацтва, керамікі і шкла, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод найбольш цікавых экспанатаў — калекцыя размаляваных дываноў, якая налічвае 130 адзінак, з іх 30 выраблены Я. Драздовічам. Цэнтральным аб'ектам этнаграфічнага комплексу музея-запаведніка з'яўляецца музей «Млын».

**2000** год — Мірскі замак унесены ў Спіс аб'ектаў культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Дадзенае рашэнне было прынята на сесіі Камітэта ЮНЕСКА па сусветнай спадчыне, пасяджэнне якога праходзіла ў аўстралійскім горадзе Кернсе.

**У свеце**

**1774** год — завяршэнне судовага працэсу над удзельнікамі Пугачоўскага паўстання. Вынесены смяротны прысуд Емяльяну Пугачову, Максіму Шыгаеву і іншым.



**1869** год — нарадзіўся Анры Маціс, французскі мастак і скульптар. Вядомы сваімі творчымі пошукамі ў перадачы эмоцый праз колер і форму.

**1910** год — нарадзілася Валянціна Сцяпанаўна Грызадубава, савецкая лётчыца і грамадскі дзеяч, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1938 годзе ў складзе каманды лётчыц здзейсніла беспасадачны пералёт Масква — Далёкі Усход. У гады Вялікай Айчыннай вайны была на фронце, у 1942—1944-м — камандзір 101-га авіяцыйнага палка далёкага дзеяння, самалёты якога дастаўлялі войскам боепрыпасы, лятаалі ў тыл ворага да беларускіх партызанаў, удзельнічалі ў Беларускай аперацыі 1944 года. Здзейсніла каля 200 баявых вылетаў. З 1946 года служыла ў грамадзянскай авіяцыі.

**1933** год — нарадзіўся Сямён Фарада, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст Расійскай Федэрацыі.

**1992** год — апошні дзень існавання дзяржавы Чэхаславакія.

**Так гаварыў...**

**ГАРАЦЫЙ:**

*«Часы змяняюцца, і мы змяняемся разам з імі».*

## УСМІХНЕМСЯ

Склала спіс спраў, якія неабходна зрабіць у сувязі з надыходзячым Новым годам, перачытала, і ўзнікла ў мяне пытанне: «А Новы год — сапраўды свята?»

**Ды што ты ведаеш пра мары? Я вось у дзяцінстве марыў жыць асобна ад бацькоў, каб мець магчымасць есці кавун лыжкай, а не рэзаць яго на долькі.**

Аб'ява. Аддам у добрыя рукі выдатныя парады, якімі не карысталіся, у цудоўным стане.




**Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 4 студзеня.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3232.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12